

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**



Планіроўка вуліцы справакавала канфлікт

СТАР. 6



Культурныя сувязі для пад'ёму эканомікі

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 СНЕЖНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 235 (27600) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ЁЛКІ З СЮРПРЫЗАМ



Фота БЕЛТА.

*11 снежня ў Рэспубліканскім цэнтры тэхнічнай творчасці адкрылася рэспубліканская выстава ёлак, ёлачных цацак і ўпрыгажэнняў «Ёлка як арт-аб'ект». На выставе прадстаўлены больш за 600 арт-ёлак і ўпрыгажэнняў для іх.*

■ Парламенцкі дзённік

## ДЭПУТАТЫ РАЗГЛЕДЗЕЛІ БЮДЖЭТНЫ ПАКЕТ

**Напружанасць абстаноўкі, у якой распрацоўваўся законапраект аб рэспубліканскім бюджэце на 2014 год, адчувалася і на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў, дзе дакумент быў учора прыняты ў першым чытанні. Акрамя традыцыйных для пятага склікання пытанняў асноўнаму дакладчыку, была агучана прапанова выставіць норму аб увядзенні аўтамабільнай пошліны на галасаванне асобна. Аднак прапанова не была падтрымана, у тым ліку з-за таго, што парушала рэгламент.**

**Тым не менш дэпутатам, якія не згодны з тым, як прапісаная гэтая норма, пакінулі права ўнесці свае прапановы ў галаўную камісію падчас падрыхтоўкі законапраекта да другога чытання.**

### ФОНД САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ — З ПРАФІЦЫТАМ

Частка бюджэтнага пакета законапраектаў была ўчора прынята Палатай прадстаўнікоў адразу ў двух чытаннях. Яна тычыцца пазабюджэтных фондаў сацыяльнай абароны насельніцтва, Дэпартамента выканання пакаранняў і грамадзянскай авіяцыі.

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА** паведаміла дэпутатам, што агульная сума даходаў бюджэту фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2014 год плануецца ў суме Br95 трлн. Найбольшую ўдзельную вагу (99%) у структуры даходнай часткі бюджэту маюць абавязковыя страхавыя ўнёскі. У дачыненні да ВУП даходы бюджэту фонду складаюць амаль 13%.

«Выдаткі бюджэту фонду разлічаны ў суме Br93,6 трлн. І вялікая іх частка (77%, або Br72 трл) накіроўваецца на пенсійнае забеспячэнне,— адзначыла міністр.— Выдаткі на выплату пенсій вызначаюцца, зыходзячы з колькасці атрымальнікаў, якія ў нас ёсць (гэта 2,5 млн), а таксама зыходзячы з таго, што каэфіцыент замяшчэння павінен быць не менш за 40%».

Бюджэт фонду таксама прадугледжвае захоўванне аплаты паслуг па выплаце пенсій. «Br840 млрд закладзена на тое, каб людзям было зручна атрымліваць пенсіі тым спосабам, які яны выбіраюць: альбо праз пошту, альбо праз дастаўку на дом»,— адзначыла Марыяна Шчоткіна.

Наступны па велічыні артыкул выдаткаў бюджэту (амаль 21%) складае выплата дапамог па дзяржаўным сацыяльным страхаванні: па мацярынстве, сямейныя дапамогі, дапамогі па часовай непрацаздольнасці.

З бюджэту фонду будзе ажыццяўляцца таксама фінансаванне санаторна-курортнага лячэння, аздараўлення насельніцтва, спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў Федэрацыі прафсаюзаў. Матэрыяльная дапамога пенсіянерам, якія маюць у гэтым патрэбу, прадугледжана ў памеры Br36 млрд. Асобным артыкулам прадугледжана выплата дадатковых прафесійных пенсій.

«У цэлым бюджэт фонду сфарміраваны з перавышэннем даходаў над расходамі за кошт сродкаў прафесійнага пенсійнага страхавання ў суме Br1,4 трлн. І ў адпаведнасці з заканадаўствам падлягае назапашванню,— адзначыла міністр працы і сацыяльнай абароны.— То бок, гэта прафіцыт, які з кожным годам будзе расці».

— У Канстытуцыі Беларусі грамадзянам гарантуецца права на сацыяльнае забеспячэнне ў старасці, у выпадку хваробы, інваліднасці, страты працаздольнасці, карміцеля і ў іншых выпадках,— звярнуў увагу калег судакладчык па законапраекце **Уладзімір ШЫЦЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах.**— Бюджэт фонду спланаваны з прафіцытам, што дазволіць гарантаваць выплату пенсій і дапамог у запланаваным аб'ёме.

СТАР. 2

АНОНС «ПРАМОЙ ЛІНІІ»

### УСЕ ПЫТАННІ ГРАШОВА-КРЭДЫТНАЙ ПАЛІТЫКІ

**18 снежня 2013 года з 11.00 да 12.00** у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Надзеі Андрэеўны ЕРМАКОВАЙ**. Калі вас хвалююць пытанні стабільнасці курсу беларускага рубля, захавання ўласных зберажэнняў, працэнтаў па ўкладах і крэдытах і любыя іншыя аспекты грашова-крэдытнай палітыкі нашай краіны, — тэлефануйце!

Задаваць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефонах **8 (017) 287 18 66 і 8 (017) 287 18 71**. Папярэднія пытанні дасылайце на электронны адрас рэдакцыі **info@zvyazda.minsk.by**.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Намеснік дырэктара Дэпартамента па ядзернай энергетыцы Міністэрства энергетыкі Беларусі Васіль ПАЛЮХОВІЧ:**

***«З пускам атамнай электрастанцыі доля ядзернай энергетыкі ў энергетычным балансе Беларусі складзе каля 40%. Дзякуючы ўводу ў эксплуатацыю Беларускай атамнай электрастанцыі знізіцца доля газу, што выкарыстоўваецца для выпрацоўкі электраэнергіі. Гэта прывядзе наш энергетычны баланс у нармальны стан. У многіх краінах прынята, каб ніводная крыніца не дамінавала ў вытворчасці электраэнергіі, а ўсё размяркоўвалася паміж рознымі крыніцамі. Уласная АЭС дасць магчымасць і дыверсіфікаваць паліва, і павысіць энергетычную бяспеку краіны, паколькі атамная станцыя дасць магчымасць атрымліваць бесперабойную выпрацоўку электраэнергіі на працягу аднаго года як мінімум. Запасаў паліва на станцыі хапае на адзін год, а за год можна вырашыць любыя пытанні і не так залежаць ад ваганняў цэн на энерганосьбіты на рынку».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.12.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9420,00 | ▲ |
| Еўра | 12990,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 287,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1138,37 | ▼ |

■ Перспектыва

## ХАЧУ СТАЦЬ ВАЖАТЫМ. НЯХАЙ МЯНЕ НАВУЧАЦЬ...

**Міністэрства адукацыі выступіла з прапановай дазволіць працаваць з дзецьмі ў аздараўленчых летніках *студэнтам любых спецыяльнасцяў.* Але гэтую ініцыятыву галоўнага адукацыйнага ведамства павінны яшчэ падтрымаць у Міністэрстве працы і абароны.**

— У гэтым зацікаўлены і мы, і ўласнікі аздараўленчых летнікаў, і самі студэнты, — заявіў журналістам на прэс-канферэнцыі **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.**

Традыцыйна перавага пры адборы кандыдатаў на працу ў аздараўленчым летніку аддавалася педагогам з вопытам работы або студэнтам педагагічных спецыяльнасцяў. А ў будучага праграміста або радыёфізіка шанцаў прымераць на сабе ролю важатага не было. Без папярэдняй падрыхтоўкі чалавека з вуліцы ніхто б да дзяцей не дапусціў. І не дапусціць, нават калі прапанова Міністэрства адукацыі і будзе задаволена. Усё роўна ўсе ахвотнікі папрацаваць летам з дзецьмі пройдуць абавязковы «курс маладога байца». Падобны досвед у Беларусі ўжо маецца...

Пры падтрымцы Мінгарвыканкама, Камітэта па адукацыі і Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ два гады таму ў сталіцы быў запушчаны новы праект — педагагічны атрад «Белая Русь», «эксклюзіўнасць» якога заключаецца ў тым, што стаць важатымі або кіраўнікамі гурткоў маглі студэнты любых ВНУ. Праўда, пры адной умове — пасля праходжання спецпадрыхтоўкі і атрымання адпаведнага сертыфіката. І працавалі важатымі беларускія студэнты не ў сябе на радзіме, а ў Туапсінскім раёне, у дзіцячым санаторна-аздараўленчым цэнтры «Залаты колас», дзе адпачываюць дзеці з усёй Расіі. Базай, дзе навабранцы праходзілі «баявое хрышчэнне», быў Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі. Маладыя людзі «закрывалі» фактычна ўвесь спектр «пасад»: працавалі важатымі, кіраўнікамі гурткоў, спартыўных секцый, фізрукамі, інструктарамі па плаванні, арганізатарамі мерапрыемстваў і дыджэямі.

Калі ў Міністэрстве працы падтрымаюць прапанову педагогаў, то ўжо наступным летам беларускія студэнты любых спецыяльнасцяў змогуць працаваць не толькі ў расійскіх, але і ў беларускіх летніках. Як сцвярджаюць у Міністэрстве адукацыі, зарабіць за адну змену важатыя маглі сёлета да 3 мільёнаў рублёў. Праўда, у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» важатыя зарабляюць і да 6 мільёнаў рублёў.

У студзені на партале Міністэрства адукацыі абяцаюць прадставіць увесь спектр аздараўленчых лагераў, якія будуць дзейнічаць наступным летам — з указаннем іх месцазнаходжання, профілю, напаўняльнасці, тэматычных змен і г.д.. Так бацькам прасцей будзе арыентавацца і планаваць летні адпачынак сваіх дзяцей.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ПЛАТНЫЯ ДАРОГІ ДАДУЦЬ КРАІНЕ 400 млрд РУБЛЁЎ

**BelToll, электронная сістэма збору платы за праезд, дзейнічае больш за 4 месяцы. Яе камерцыйная эксплуатацыя пачалася 1 жніўня. Колькасць зарэгістраваных карыстальнікаў (транспартных сродкаў) у сістэме ўжо перавышае 150 тысяч.**

### УСЯ М4 СТАНЕ ПЛАТНАЙ З 1 СТУДЗЕНЯ

«Але сістэма развіваецца далей, — заявіў учора журналістам Яўген Ракала, начальнік Галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый. — Мы чакаем, што з 1 студзеня 2014 года будзе ўведзены дадатковы ўчастак платных аўтамабільных дарог. Мяркуецца таксама, што з 1 ліпеня наступнага года сетка платных аўтадарог павялічыцца яшчэ». Па словах чыноўніка, з 1 студзеня будзе ўведзена плата за праезд па дарозе М4 (Мінск — Магілёў) на ўсёй яе даўжыні. Сёння плата на гэтай дарозе бярэцца толькі на ўчастку ад выезду з Мінска да 74-га кіламетра. «У далейшым, пасля рэканструкцыі, платнай стане дарога Мінск — Гомель. Платнымі будуць станавіцца і іншыя дарогі, што адпавядаюць неабходным параметрам».

Эксплуатацыя новай сістэмы аплаты прынесла і некаторыя негатыўныя моманты. Ёсць прэтэнзіі, незадаволенасць. Хтосьці не згодзен з выстаўленымі актамі парушэння па спагнанні платы ў павялічаным памеры. Хтосьці не згодзен з парадкам спагнання платы. «Мы са службамі тэхнічнага аператара гэтай сістэмы правялі аналіз і маем прыблізныя лічбы — са 150 тысяч карыстальнікаў прыкладна толькі 1-2% выказваюць незадавальненне і скаргі. Часцей за ўсё парушэнні адбываюцца з-за таго, што чалавек не дачытаў, не разабраўся, не там замацаваў бартавую прыладу ці ўвогуле яе не замацаваў, не папоўніў своечасова баланс», — пералічвае Яўген Ракала. Дарэчы, ён сцвярджае, што менш за ўсё пытанняў узнікае ў прафесійных перавозчыкаў, якія ўжо знаёмы з аналагічнымі сістэмамі ў Еўропе. Але цяпер ужо ідзе спад прэтэнзій і зваротаў — людзі прывыклі, разабраліся.

### У НЕКАТОРЫХ ВЫПАДКАХ АПЛАТУ ЗНІЗЯЦЬ?

«Мы рыхтуем нарматыўны акт, які даў бы нам магчымасць знізіць аплату ў павялічаным памеры ў пэўных выпадках парушэнняў. Гэта будзе тычыцца тых прэцэдэнтаў, якія адбыліся ў першыя два месяцы эксплуатацыі, калі людзі яшчэ не ведалі, як усё працуе», — сказаў Яўген Ракала. Аднак чыноўнік папярэдзіў, што не трэба чакаць поўнага вызвалення ад выплаты — яна можа быць толькі зніжана, і толькі адносна некаторых парушэнняў.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МАЙДАН МОЖА ПЕРАШКОДЗІЦЬ УКРАІНЕ ЗАЛУЧЫЦЬ АЛІМПІЯДУ

Становішча ў цэнтры Кіева, на плошчы Незалежнасці, учора заставалася спакойным. Да сярэдзіны дня чацвярга там сабралася каля двух дзясяткаў прыхільнікаў еўраінтэграцыі. Таксама некалькі тысяч чалавек з раніцы пікетавалі будынак Генеральнай пракуратуры, патрабуючы спыніць «рэпрэсіі» супраць удзельнікаў акцый пратэсту. Паралельна ля будынка Вярхоўнай Рады некалькі тысяч прыхільнікаў Партыі рэгіёнаў прынялі ўдзел у мітынгу ў падтрымку прэзідэнта Віктара Януковіча. Каментуючы тое, што адбываецца ў цэнтры ўкраінскай сталіцы, прэм'ер-міністр Мікалай Азараў зрабіў цікавую заяву: палітычная нестабільнасць у краіне можа перашкодзіць Украіне прэтэндаваць на зімовую Алімпіяду 2022 года. «Вядома, сённяшняя палітычная нестабільнасць у краіне, безумоўна, зніжае нашы шанцы на паспяховае праходжанне адборачнага тура»,— цытуе NEWSru.ua выступленне прэм'ера. Азараў выказаў надзею на больш хуткае ўрэгуляванне сітуацыі.

### СПІРТНОЕ Ў НЕВЯЛІКІХ ДОЗАХ ПАДАЎЖАЕ ЖЫЦЦЁ?

Універсітэт Тэхаса заяўляе: алкаголь падаўжае жыццё. Але пазітыўна ўплывае толькі ўмеранае спажыванне спіртнога, піша Micro Finance Monitor. Аналіз больш як 1000 чалавек 55–65 гадоў, які праводзіўся на працягу 20 гадоў, паказаў: 1–3 порцыі алкаголю за дзень — ідэальны аб'ём спажывання. За час даследавання 60% людзей, якія шмат выпівалі, і 69% людзей, якія не пілі зусім, памерлі. З групы, якая піла ўмерана, такіх быў 41%. Падобныя высновы агучылі яшчэ ў 2010 годзе. Але тады рэкамендавалася выпіваць па 1–2 порцыі спіртнога. Актыўнае спажыванне алкаголю павышала смяротнасць на 42%, а адмова ад спіртнога — на 49%. Магчыма, гэта было выклікана тым, што не пілі былыя алкаголікі і людзі з праблемамі са здароўем і нізкім узроўнем фізічнай актыўнасці. Само па сабе частае спажыванне спіртнога небяспечнае для жыцця і здароўя. Дарэчы, падобнае даследаванне нядаўна абнародаваў і ўніверсітэт Тэль-Авіва. Паводле яго, кафеін скарачае працягласць жыцця, а алкаголь, наадварот, павялічвае.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### НАРВЕГІЯ ПРОСІЦЬ ШВЕЦЫЮ ЗДАЦЬ ЁЙ У АРЭНДУ ТУРМЫ

Нарвегія папрасіла сваю суседку Швецыю здаць ёй у арэнду турэмныя памяшканні, гэтым яна хоча пакласці канец дэфіцыту камер, з-за якога паліцыі даводзіцца вызваляць злачынцаў, паведамляе The Local. Па звестках нарвежскай паліцыі, цяпер у краіне знаходзяцца 1200 злачынцаў, якім патрабуюцца месцы ў турмах. «Мы больш не можам працягваць жыць пры сітуацыі, якая склалася. У нашы турмы доўгія чэргі, таму мы звязаліся са шведскім бокам, каб абмеркаваць, ці магчыма нам арандаваць у іх месцы», — заявіў міністр юстыцыі Нарвегіі Андэрс Анундсан. Гэты крок стане прамежкавым захадам, падкрэсліў міністр. У перспектыве рашэннем стане будаўніцтва большай колькасці турмаў, аднак гэта запатрабуе часу. Здача ў арэнду месцаў пазбаўлення волі можа пачацца ўжо ў 2014 годзе, адзначаюць мясцовыя СМІ. Нарвегія не першая краіна, якая просіць у Швецыі здаць у арэнду турэмныя памяшканні. У 2010 годзе Бельгія адправіла 500 сваіх грамадзян на адбыванне турэмнага тэрміну за мяжу. За арэнду памяшкання Бельгія заплаціла Швецыі 30 млн еўра.



КОРАТКА

Мінімальная заработная плата за лістапад 2013 года індэксуецца на 6,8 працэнта, як і ў мінулым месяцы. Гэта абумоўлена тым, што індэкс спажывецкіх цэн за лістапад не перавысіў пяціпрацэнтны парог да месяца папярэдняй індэксацыі (верасень гэтага года).

Беларусь атрымае больш як 1,8 млн еўра на вырашэнне праблемы нелегальнай міграцыі па праекту ЕС/ПРААН. Праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі накіраваны на павышэнне патэнцыялу Дзяржпагранкамітэта Беларусі ў сферы процідзеяння нелегальнай міграцыі і забеспячэння захавання правоў слабаабароненых груп.

У Беларусі ў студзені—верасні 2013 года доля хатніх гаспадарак з узроўнем сярэднедушавых наяўных рэсурсаў ніжэйшым за бюджэт пражытковага мінімуму (нацыянальнай мяжы малазабяспечанасці) склала 4,1 працэнта. У гарадах і пасёлках гарадскога тыпу гэты паказчык быў 3,4 працэнта, у сельскіх населеных пунктах — 6 працэнтаў.

XIII Міжнародны фестываль праваслаўных песнапенняў «Каложскі благавест» пройдзе ў Гродне 19-22 лютага 2014 года.

У Мінску гэтай зімой будуць працаваць 80 каткоў для масавага катання (у тым ліку 71 каток — на тэрыторыях устаноў адукацыі), 36 хакейных каробак, 16 лыжных трас.

## ВАКЗАЛ ДЛЯ СПАДАРОЖНІКА

**У будучым спадарожніку Мінска, мястэчку Рудзенск, скончылася рэканструкцыя чыгуначнага прыпыначнага пункта. Адноўлены будынак вакзала ўжо прымае пасажыраў.**

— Кожныя суткі на станцыі прадаецца каля тысячы квіткоў,— расказвае Вольга Доўгая, начальнік станцыі «Рудзенск».— Людзі едуць на працу ў пасёлкі, што знаходзяцца побач. Вялікая колькасць жыхароў Рудзенска працуе ў сталіцы. Таму магчымасць камфортнай паездкі, якая пачынаецца з набыцця квітка,— гэта крок насустрач пасажырам.

Работы па аднаўленні прыпыначнага пункта пачаліся ў красавіку бягучага года. Падчас рэканструкцыі быў цалкам зменены перон, зроблены падземныя выхады да платформаў, зала чакання стала цёплай і ўтульнай.

**Любоў БЯЛЯЕВА.**
**Фота аўтара.**



## Віншаванне Прэзідэнта

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў ААТ «Інтэграл» — кіруючая кампанія холдынга «Інтэграл» з 50-годдзем з дня ўтварэння прадпрыемства.**

«Калектыў прадпрыемства змог развіць магутны навукова-гаспадарчы комплекс, які забяспечвае поўны цыкл распрацоўкі і вытворчасці высокатэхналагічнай прадукцыі — ад крэмніевых пласцін да інтэгральных мікрасхем і электроннай апаратуры», — гаворыцца ў віншаванні.

«Сёння «Інтэграл» з'яўляецца адным з усходнееўрапейскіх лідараў у мікраэлектроннай вытворчасці. Холдынг праводзіць featureзнабаковыя даследаванні, укараняе перадавыя тэхналогіі і больш за 70% вырабаў пастаўляе амаль на ўсе кантыненты, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Упэўнены, што вы і ў далейшым захаваеце дасягнутыя пазіцыі, зможаце пашырыць прысутнасць беларускіх электронных кампанентаў на сусветным рынку».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

■ Тры пытанні да ўлады

# ТУРЫСТАЎ... ПА ХЛЕБЕ ЛІЧАЦЬ

**Старшыня Браслаўскага райвыканкама Сяргей ШМАТАЎ вясной мінулага года агучыў ідэю актыўна развіваць турызм. У прыватнасці, ён задумаў адрадзіць традыцыі правядзення рэгат у азёрным краі, адкрыць яхт-клуб.**



***— Наконт яхт-клуба і рэгат... Можа, з-за неабходнасці выканаць больш важныя пытанні адмовіліся ад рэалізацыі сваёй ідэі?***

— Не. Тое, што планавалася, паэтапна ажыццяўляецца. Яхтрух адрадзілі, ужо прайшлі дзве рэгаты. І ў наступным годзе ў нас пройдуць спаборніцтвы пад эгідай Федэрацыі паруснага спорту. Плануем адкрыць дзіцяча-юнацкую школу: федэрацыя дапамагае яхтамі, мы курыруем пытанні трэнерскага саставу, памяшкання.

***— Браслаўшчына — унікальны край. У Браслаўскую групу азёр уваходзіць больш як трыццаць азёр агульнай плошчай 113,2 кв. км. Ці можа раён прыняць усіх ахвотных (незалежна ад матэрыяльнага дастатку) адпачыць?***

— Безумоўна, турыстычныя кропкі павінны быць featureзнага ўзроўню. Вясной адкрываецца турыстычны комплекс «Ніка-прэстыж» з некалькімі рэстаранамі, 60 месцамі для размяшчэння гасцей. Гэты комплекс добрага ўзроўню. З туркамі вядзём перамовы: яны хочуць пабудаваць атэль. Задумана, што там з'явіцца спа-салон, забаўляльны цэнтр. Сёння гэтае пытанне знаходзіцца на ўзроўні заключэння інвестыцыйнага праекта.

Далёка за межамі Беларусі вядомы Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры». Турыстаў туды прыязджае шмат, але ж няма інфраструктуры адпачынку. Гэтае пытанне будзе абмяркоўвацца з кіраўніцтвам упраўлення справамі, якому належыць запаведнік. Калі казаць пра развіццё турызму — мы рухаемся наперад, але ж, вядома, каб рэалізаваць усё задуманае, патрэбны грошы.

***— Колькі людзей, па вашых падліках, штогод прыязджае адпачыць у раён?***

— Турыстаў, калі яны не прыязджаюць арганізаванымі групамі, безумоўна, вельмі складана падлічыць. Але магу падзяліцца цікавымі назіраннямі дырэктара нашага хлебазавода. Ён кажа, што колькасць прыезджых можна падлічыць па тым, наколькі павялічваецца спажыванне хлеба. Летам гэты паказчык у два разы большы. У райцэнтры жыве каля 10 тысяч чалавек, прыкладна столькі ж турыстаў прыязджае ў пік сезона адпачынку.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

# ПЛАТНЫЯ ДАРОГІ ДАДУЦЬ КРАІНЕ 400 млрд РУБЛЁЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але нават пры ўмове вяртання нейкіх сум грошай Міністэрства транспарту і камунікацый чакае, што да канца бягучага года паступленні ў бюджэт збораў, якія бяруцца ў сістэме BelToll, складуць каля 400 млрд рублёў. Між іншым, гэта і шмат, і не вельмі аднachасова. Бо насамрэч патрэба толькі рэспубліканскіх дарог складае 6-7 трлн рублёў. «810 кіламетраў платных дарог не могуць забяспечыць належную эксплуатацыю і будаўніцтва дарог, бо толькі рэспубліканскіх — 15 тысяч кіламетраў», — адзначыў Яўген Ракала.

## Колькасць парушэнняў змяншаецца

Леанід Лемеш, начальнік транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый, расказаў, што за першы месяц эксплуатацыі сістэмы было зафіксавана 93 тысячы парушэнняў, а ўсяго з пачатку дзеяння — каля 180 тысяч. Пасля жніўня назіраўся спад: у верасні — 36 тысяч парушэнняў, у кастрычніку — 28 тысяч, у лістападзе — 18 тысяч. «Практычна ўвесь камерцыйны транспарт разумее, што трэба плаціць», — дадаў прадстаўнік транспартнай інспекцыі. Таксама ён звярнуў увагу на тое, што амаль палова парушальнікаў (каля 83 тысяч) — замежнікі, якія эксплуатуюць легкавы транспарт. «Але ўсе дарожныя знакі ёсць. Інфармацыі хапае. Яны самі вінаватыя, што яшчэ да прыезду не пацікавіліся падобнымі рэчамі, — каментуе сітуацыю Сяргей Буры, менеджар па маркетынгу, сувязях з грамадскасцю і карпаратыўных сувязях ЗТАА «Капш Тэлематык Сэрвісіз». — І ўвогуле: правілы правозу алкаголю ведаюць, напэўна, усе, а пра платныя дарогі пачытаць чамусьці людзі лянуюцца». Дарэчы, цяпер адбываецца каля 300-400 парушэнняў штодзень.

Уладальнікам электроннай сістэмы збору платы за праезд па аўтатрасах з'яўляецца ДУ «Белаўтастрада». Кіруе працай BelToll у Беларусі кампанія-аператар прадпрыемства «Капш Тэлематык Сэрвісіз», у задачы якой уваходзяць забеспячэнне належнага функцыянавання сістэмы і ажыццяўленне ўсіх неабходных функцый, звязаных з яе дзейнасцю. Кантралюе спагнанне збораў на платных аўтамагістралях ДУ «Транспартная інспекцыя».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# ДЭПУТАТЫ РАЗГЛЕДЗЕЛІ БЮДЖЭТНЫ ПАКЕТ

**Бюджэтным фінансаваннем будзе забяспечана прадастаўленне льготнага праезду асобным катэгорыям грамадзян, у тым ліку пенсіянерам пры дапамозе сезоннай 50-працэнтнай зніжкі кошту праезду ў прыгарадных зносінах на ўсіх відах транспарту з 1 мая па 30 верасня. На гэтыя мэты бюджэт прадугледжвае неабходныя асігнаванні.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## На самалёце з Мінска ў Віцебск

Асноўную частку фонду грамадзянскай авіяцыі (83%, або Br105 млрд) плануецца выдаткаваць на набыццё новых паветраных суднаў і навучанне персаналу, а таксама на будаўніцтва, праектна-пошукавыя работы і набыццё абсталявання. Пра гэта дэпутатам паведаміў, прадстаўляючы законапраект аб бюджэце фонду, **міністр транспарту і камунікацый Анатоль СІВАК**.

На пытанне **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Віктара РУСАКА** аб тым, ці дастаткова сродкаў пазабюджэтнага фонду для фарміравання стратэгіі развіцця грамадзянскай авіяцыі, міністр прызнаўся: «Безумоўна, сродкаў гэтага фонду недастаткова». Разам з тым ён дадаў, што праблема ўзросту самалётаў, якія эксплуатуюцца, не з'яўляецца актуальнай для Беларусі. «У нас ёсць праблема пашырэння парку самалётаў, і гэтыя пытанні мы пэўным чынам сёння вырашаем», — растлумачыў Анатоль Сівак. Ён дадаў, што, у адрозненне ад мінулых гадоў, сродкі фонду будуць у асноўным накіроўвацца на з'яўленне і падтрымку ўнутрырэспубліканскіх міжрэгіянальных авіяперавозак. Такія праекты ў нас распрацоўваюцца, і я як міністр хацеў бы гэта рэалізаваць у 2014 годзе».

Упершыню Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прыняла праект закона «Аб зацвярджэнні бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь на 2014 год». **Намеснік міністра ўнутраных спраў Віктар ДУБАВЕЦ** паведаміў, што даходы фонду на 2014 год плануюцца ў суме Br15 млрд, а расходы, адпаведна, таксама Br15 млрд. Адказваючы на пытанне **дэпутата Уладзіслава ШЧЭПАВА,** намеснік міністра дадаў, што ў сістэме Дэпартамента дзейнічаюць 15 рэспубліканскіх унітарных вытворчых прадпрыемстваў, адзін філіял і 11 вытворчых майстэрняў.

Даходы пазабюджэтнага дзяржфонду плануецца фарміраваць за кошт паступленняў (даходаў) ад выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца ў дзяржуласнасці. На закупкі тэхналагічнага абсталявання і транспартных сродкаў прадпрыемствам, папраўчым установам і ЛПП, якія падпарадкаваны Дэпатаменту, запланавана Br7,75 млрд. На закупкі сыравіны закладзена Br7 млрд. На такія мэты, як правядзенне семінараў, кірмашоў, выставак, падпіску перыёдыкі, выраб рэкламных буклетаў аб прадукцыі прадпрыемстваў і іншае, прадугледжваюцца затраты ў памеры Br250 млн.

## Транспарт і ЖКГ будуць даражэць паэтапна

Найбольшую дыскусію выклікалі два законапраекты, якія ў адным дакладзе прадстаўляў **міністр фінансаў Андрэй ХАРКАВЕЦ**: аб унясенні змяненняў у законы па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці, падаткаабкладанні і адміністрацыйнай адказнасці і аб рэспубліканскім бюджэце. Частка дэпутатаў выказалі сумненні, што знойдзены самы аптымальны варыянт па дадатковым фінансаванні беларускіх дарог і вуліц — праз аўтамабільную пошліну, якую з новага года будуць выплачваць уладальнікі машын пры праходжанні тэхагляду. Да панядзелка дэпутатам, не згодным з гэтай нормай, трэба будзе пераканаць у сваіх поглядах Пастаянную камісію па бюджэце і фінансах, якая адказвае за падрыхтоўку бюджэтных дакументаў.

Андрэй Харкавец паведаміў, што пакрыццё насельніцтвам затрат на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі да канца 2014 года будзе складаць не менш за 25%. У бюджэце захоўваецца значная падтрымка насельніцтва па паслугах ЖКГ і транспарце. У 2014 годзе плануецца накіраваць на субсідаванне жыллёва-камунальных паслуг сродкі мясцовых бюджэтаў у аб'ёме больш як Br9 трлн. Гэта каля 8% іх агульных выдаткаў.

З будучага года ўкараняецца новы механізм субсідавання жыллёва-камунальных паслуг, якія аказваюцца насельніцтву. Агульны парадак будзе зацверджаны ўрадам і аблвыканкамамі. Субсідавацца будуць аказаныя насельніцтву жыллёва-камунальныя паслугі, зыходзячы з вызначаных нарматываў, а таксама іх натуральных аб'ёмаў. Пры гэтым прадугледжваецца, што сэканомленыя арганізацыямі ЖКГ сродкі застануцца ў іх распараджэнні. «Гэта павінна стаць істотным стымулам паляпшэння работы арганізацый галіны», — лічыць міністр.

Пры планаванні выдаткаў на транспарт захоўваюцца падыходы па паэтапным павышэнні тарыфаў для насельніцтва. У гэтых умовах субсідыі арганізацыям транспарту на пакрыццё часткі затрат па перавозцы пасажыраў скароцяцца ў 2014 годзе прыкладна на Br0,5 трлн. Больш за Br800 млрд сродкаў мясцовых бюджэтаў плануецца накіраваць на набыццё рухомага складу пасажырскага транспарту, што дасць магчымасць абнавіць транспартны парк больш чым на 400 адзінак тэхнікі.

Усяго ўчора было разгледжана 10 законапраектаў, у тым ліку ў другім чытанні — дапаўненні і змяненні ў Законы «Аб вайсковай службе», «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі» і ў некаторыя законы па пытаннях рэгулявання зямельных адносін.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Меркаванне

# ПАДАТАК З ДАРМАЕДАЎ: ЗА і СУПРАЦЬ

**Прапанова абкласці пошлінай грамадзян, якія не працуюць і не плацяць падаткаў, але з'яўляюцца спажыўцамі сацыяльных паслуг, выклікала шырокі рэзананс. Сёння мы публікуем дзве думкі на гэты конт.**

## ЗА, АЛЕ...

**Алег ЛЕЎШУНОЎ, член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— У Палату прадстаўнікоў такі законапраект не паступаў. Калі ён паступіць, мы будзем вывучаць гэтае пытанне. Асабіста я буду разглядаць яго з пазіцыі, каб не парушаліся правы грамадзян. І яшчэ: калі такі закон будзе прыняты, ён павінен быць працуючым, г.зн. калі ён з'явіцца, а выконвацца не будзе, то ніякай рацыі прымаць яго няма. Значыць, трэба будзе распрацаваць дзейсны механізм яго рэалізацыі.

Пакуль што, паўтаруся, я гэтага законапраекта не бачыў. Але, улічваючы тое, што ў грамадстве вядуцца размовы пра яго, я магу выказаць сваю пазіцыю па гэтым пытанні.

Я лічу, што любы грамадзянін, які пражывае ў той ці іншай дзяржаве, павінен удзельнічаць у жыцці грамадства, фарміраваць сацыяльны кошык і г.д. Кожны працаздольны грамадзянін павінен плаціць падаткі, бо гэта асноўны складнік нашага бюджэту. Таму ўсе мы, карыстаючыся дзяржаўнымі выгодамі, павінны ўносіць пасільны ўклад у іх фарміраванне.

Але трэба прапрацаваць падыходы. Ёсць розныя катэгорыі насельніцтва. Напрыклад, хатнія гаспадыні. Мая пазіцыя: калі муж зарабляе дастаткова для таго, каб яго жонка выхоўвала дзяцей і не працавала, то ён ужо выплачвае адпаведныя падаткі.

Акрамя таго, сёння мы гаворым аб катэгорыі грамадзян (і тут згадваюцца розныя лічбы) — недзе пра 445-470 тысяч працаздольных людзей, якія не плацяць падаткаў. Але, з другога боку, яны ездзяць на грамадскім транспарце або на асабістай машыне — па дарогах, якія рамантуе дзяржава. Паслугі ЖКГ таксама аплачваюць не цалкам — іх аплату, як мы ведаем, часткова бярэ на сябе ўсё тая ж дзяржава. Ці ўзяць вулічнае асвятленне або дзіцячыя сады, дзе бацькі аплачваюць толькі мізэрную частку выдаткаў; або гарадскі транспарт, што таксама датуецца дзяржавай... Чаму хтосьці павінен уносіць частку зробленых грошай у выглядзе падаткаў на функцыянаванне ўсіх сацыяльных інстытутаў, а хтосьці — не, пры гэтым карыстаючыся імі?

Але як распрацаваць механізм спагнання такога падатку? Як выявіць такія катэгорыі грамадзян, як спагнаць з іх грошы? Пры гэтым трэба ўлічваць магчымасці такіх людзей, стан іх здароўя, даходы і г.д. Падыходы да розных слаёў насельніцтва, розных катэгорый людзей павінны быць розныя. І называць гэты падатак падаткам з дармаедаў, на мой погляд, не зусім карэктна. У нас жа афіцыйных беспрацоўных вельмі мала, усяго дзесьці 0,5% ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва...

## СУПРАЦЬ

**Леанід КОЗІК, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**

— Статыстыка сведчыць, што ў нас афіцыйна беспрацоўнымі з'яўляюцца 0,5 % эканамічна актыўнага насельніцтва. Але афіцыйна беспрацоўныя — гэта людзі, зарэгістраваныя ў органах па працы і занятасці, якія чакаюць зручную для сябе працу. Напрыклад, возьмем выкладчыка замежнай мовы. Яму прапаноўваюць працу ў школе, а ён кажа: «Не, я хачу выкладаць у ВНУ». І чакае, пакуль там вызваліцца месца... Але ж гэта не дармаеды. Яны атрымліваюць хоць маленькую, але дапамогу па беспрацоўі. А хто тады дармаеды? Заканадаўча гэта не замацавана, я такога тэрміну не бачыў. Ёсць тыя, хто п'юць на працы. Але гэта не дармаеды, Яны ўсё ж працуюць. Напэўна, ёсць і такія, хто бадзяецца па кутах. Але як іх выявіць? І, думаю, шмат сродкаў з іх не збярэш. Раз яны не працуюць, то што з іх возьмеш?

Дзяржава павінна прыдумаць, як з імі змагацца і што рабіць, але гэта будзе не падатак. А калі дзяржава лічыць, што ў нас ёсць дармаеды, дык няхай вызначыць іх заканадаўча. Напрыклад, як раней было ў Савецкім Саюзе: 6 месяцаў не працуеш — значыць, дармаед.

Я разумею, хто тут маецца на ўвазе: так званыя «чаўнакі», якія такім чынам зарабляюць, або асобы, якія працуюць неафіцыйна. Але тады дзяржава павінна растлумачыць, чаму гэтага нельга рабіць, і дэклараваць, што гэта дармаеды. І людзі перагледзяць сваю пазіцыю. Што тычыцца тых, хто з'ехаў працаваць за мяжу, то мы ўсе сёння гаворым аб адкрытым рынку працы. Да таго ж — за што павінен плаціць такі чалавек? За квіток на цягнік ён заплаціў... Наконт лячэння: як ён паедзе сюды лячыцца, калі яму кожны дзень трэба хадзіць на працу? Што ж да яго сям'і, то жонка, хутчэй за ўсё, недзе працуе і мае права на бясплатнае лячэнне.

Да таго ж мы падпісалі з Расіяй пагадненне аб пазбяганні падвойнага падаткаабкладання... Таму ўсё ў межах прававога поля. Так што гэта вельмі складанае пытанне.

**Запісала Святлана БУСЬКО**

■

# ЗОРНЫМІ СЦЕЖКАМІ КУЛЬТУР І НАРОДАЎ

**У штаб-кватэры СНД у Мінску прайшла прэзентацыя серыі кніг «Сугучча сэрцаў», якія прадстаўляюць мастацкую літаратуру краін СНД.**



Прыгожыя назвы ў зборнікаў, якія выдавецкі дом «Звязда» прысвяціў мастацкаму слову народаў Беларусі, Расійскай Федэрацыі, Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Узбекістана, Малдовы, Таджыкістана, Туркменістана, Украіны: «Зорная крыніца», «Край мой запаведны», «Шчаслівае імгненне», «Светлая далячынь», «Жывое слова», «Святая любоў», «Шчаслівая сустрэча», «Люблю цябе, Айчына», «Не ведаючы межаў», «Залатая струна»... За вокладкамі — сучаснае прыгожае пісьменства, творы, якія прыйшлі да чытача ў асноўным пасля 1991 года. Складаны час для постсавецкай прасторы, нялёгкія выпрабаванні пройдзены народамі па шляху да суверэнітэту, незалежнасці. Поруч са здабыткамі — і балючыя памылкі і пралікі, якіх наўрад ці пазбегнуць можна было. У кнігах, дзе знайшлося месца і вершам, і ўрыўкам з раманаў, апавяданням, — партрэт часу, мастацкі летапіс, адлюстраванне таго, што было ўласціва блізкаму мінуламу. Дыялог з чытачом вядуць Юрый Бондараў і Валянцін Распуцін, Аванес Грыгаран і Эдвард Мілітанян, Паўло Моўчан і Барыс Алійнік... А яшчэ і беларусы — Янка Брыль, Іван Шамякін, Васіль Быкаў, Аляксей Дудараў, Алена Папова, Алесь Бадак, Алесь Жук, Алесь Пісьмянкоў, Таццяна Сівец...

Уступным словам размову пра здабыткі па прадстаўленні ў Беларусі літаратурнай творчасці народаў СНД адкрыў першы намеснік старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД Уладзімір Гаркун. Пра вартасці творчага праекта на прэзентацыі гаварылі першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія Ананіч (яна, дарэчы, — аўтар ідэі і каардынатар серыі), паэт Алесь Бадак, галоўны рэдактар газеты «Літаратура і Мастацтва» Таццяна Сівец, галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Мікола Мятліцкі, намеснік начальніка ўпраўлення Еўразійскай інтэграцыі МЗС Рэспублікі Беларусь Сяргей Есін, Пастаянны паўнамоцны прадстаўнік Украіны пры каардынацыйных інстытутах Садружнасці Незалежных Дзяржаў Іван Бунечка... Усе былі аднадушнымі ў выказваннях пра неабходнасць узнаўлення і пашырэння літаратурных сувязяў на постсавецкай прасторы. А «Сугучча сэрцаў» ацанілі як добры пачатак у вырашэнні гэтага клопату.

**Кастусь ХАДЫКА.**



Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует,
что с 12.12.2013 установлена процентная ставка
как по вновь принимаемым, так и открытым в период
с 04.12.2013 до 12.12.2013 срочным банковским вкладам (депозитам)
в белорусских рублях **«Гарантированный доход»**
на 35 дней — в размере **45% годовых**
*(по вкладам, принятым до 04.12.2013, установленный размер процентной ставки применяется с даты автоматического перезаключения на новый срок, начиная с 12.12.2013).*

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка».**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

■ Факт

## ДЗЕЦІ ЗАСТАЮЦЦА Ў СЯМ'І

**Прынятае рашэнне наконт лёсу дзіцячага дома сямейнага тыпу Онахавых у Пружанскім раёне. Пра трагедыю, якая напаткала гэту сям'ю, наша газета пісала 29 кастрычніка і 20 лістапада. У адзін з апошніх дзён кастрычніка не стала 39-гадовай Кацярыны Онахавай, маці 11 дзяцей, з якіх двое біялагічных і 9 прыёмных. Усю краіну тады ўразіла вестка пра самагубства неардынарнага чалавека, падзвіжніцы прыёмных сем'яў.**

Як паведаміў карэспандэнту газеты **старшыня Пружанскага райвыканкама Міхаіл СЯРКОЎ,** 5 снежня прынялі рашэнне аб тым, што дзеці застаюцца ў сям'і. Аляксандр Онахаў, муж Кацярыны, становіцца бацькам-выхавальнікам пяці дзяцей у дзіцячым доме сямейнага тыпу. Створаны яшчэ дзве апякунскія сям'і. Апекуном дваіх дзяцей стала 20-гадовая Аляксандра Онахава, студэнтка-завочніца Гродзенскага ўніверсітэта, старэйшая дачка Кацярыны і Аляксандра. Яшчэ дваіх узяла пад апеку маці Кацярыны — Вольга Вячаславаўна Станкевіч.

— А рэальна ўсе дзеці застаюцца, як і раней, у сваім доме. Думаю, што гэта найлепшы варыянт для іх у такой сітуацыі, — падзялілася сваёй думкай **Ірына КАЗАРЭЗ, начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Пружанскага райвыканкама**. — Будзем спадзявацца, што ўсё ў гэтай сям'і складзецца добра.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СТУДЭНТ ПРАЦАВАЎ ВАЛЮТЧЫКАМ

**Замежнік-студэнт БДУ за 7 месяцаў скупіў валюты на больш чым 2 млн долараў. У дачыненні да яго заведзена крымінальная справа, паведаміла «Звяздзе» старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах ГУБЭЗ МУС Рэспублікі Беларусь Вераніка Пасмеццева.**

Падазраваны дзейнічаў у складзе групы асоб (таксама замежнікаў), якія на тэрыторыі сталіцы доўгі час займаліся незаконнай скупкай валюты ў інтарэсах трэціх асоб. На думку аператыўнікаў, спажыўцамі такіх «паслуг» з'яўляліся асобы (індывідуальныя прадпрымальнікі, кіраўнікі суб'ектаў гаспадарання), якія актыўна працавалі ў ценявым сектары эканомікі і не хацелі афішаваць свае звышпрыбыткі. Супрацоўнікі ГУБЭЗ МУС устанавілі, што толькі за 7 месяцаў студэнт-іншаземец канвертаваў 20 млрд беларускіх рублёў у замежную валюту — больш за 2 млн долараў ЗША. За аказаную паслугу ён атрымліваў свой працэнт. Цяпер валютчык затрыманы, праводзіцца далейшае расследаванне.

Акрамя таго, падчас працы па крымінальнай справе выяўлены аналагічныя факты незаконнага набыцця валюты замежнымі грамадзянамі на суму больш за 600 тыс. долараў ЗША. Праца ў гэтым напрамку працягваецца.

Дарэчы, паводле крымінальнага заканадаўства, за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, звязаную з атрыманнем прыбытку ў асабліва буйным памеры, прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам ад 2 да 5 гадоў з пазбаўленнем права займацца пэўнай дзейнасцю.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## НА ТРАЛЕЙБУСЕ — АД ХАТНЯГА ГВАЛТУ

**Незвычайную акцыю правялі супрацоўнікі сацыяльнага крызіснага цэнтра для жанчын разам з валанцёрамі з універсітэта імя А. Куляшова ў Магілёве.**

На гэтым тыдні ў жыхароў і гасцей абласнога цэнтра была магчымасць праехацца бясплатна на тралейбусе без рызыкі трапіць у рады зайцаў. Упрыгожаная паветранымі шарамі і плакатамі электрамашына з 11 да 15 гадзін курсіравала па маршруце № 2. Пасажыраў частавалі цукеркамі і распавядалі ім аб міжнароднай акцыі «16 дзён без гвалту». Яны маглі пагутарыць са спецыялістамі крызіснага цэнтра, атрымаць інфармацыйны буклет і квіток з нумарам гарачай лініі для пацярпелых ад хатняга гвалту.

Па інфармацыі крызіснага цэнтра, падчас акцыі каля 500 чалавек даведаліся, што існуе такі праект, які дапамагае жанчынам і дзецям, што апынуліся ў цяжкім становішчы. Да псіхолагаў звярталіся нават ахвяры хатняга гвалту, якія не ведалі, што існуе такая дапамога.

Як паведаміў начальнік службы руху магілёўскага прадпрыемства «Гарэлектратранспарт» Аляксандр Кузін, нягледзячы на тое, што падобныя акцыі патрабуюць дадатковых затрат, яны вельмі карысныя і патрэбныя для насельніцтва. «І калі да нас звяртаюцца з просьбай падтрымаць той ці іншы сацыяльны праект, мы заўсёды ідзём насустрач», — адзначыў ён.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## КАНТРАБАНДНЫЯ РЭНТГЕНАПАРАТЫ

**На пункт мытнага афармлення «Варшаўскі мост» прыбыў аўтамабіль з Германіі, якім кіраваў непрацуючы расіянін.**

Калі правялі догляд машыны, то пад сумкамі з асабістымі рэчамі знайшлі два незадэклараваныя рэнтгенаўскія апараты коштам прыкладна 200 мільёнаў рублёў. А тавары коштам звыш 1500 еўра, якія ўвозяцца на тэрыторыю Мытнага саюза, падлягаюць дэкларацыі. Таму кантрабанднае медыцынскае абсталяванне канфіскавана да рашэння суда.

**Яна СВЕТАВА**

■

■ Нарада

# ПРАФСАЮЗЫ ЗАДАЮЦЬ ПЫТАННІ

**Учора, 12 снежня, у штаб-кватэры нацыянальнага прафцэнтра Беларусі ў Мінску адбыўся V Пленум Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Удзельнікі пленума, якія прадстаўлялі ўсе рэгіёны рэспублікі, абмеркавалі пытанні правоў і інтарэсаў працоўных, павышэнне ўзроўню іх абароны ў працоўнай і сацыяльна-эканамічнай сферах.**

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі прапанавала ўраду і Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі перагледзець правілы бязвыплатнай і льготнай перадачы некаторым арганізацыям маёмасці.

— Улічваючы, што ў апошні час адзначаецца наяўнасць прамога супрацьстаяння з боку асобных кіраўнікоў прыватных фірмаў і арганізацый стварэнню і дзейнасці прафсаюзных арганізацый, хачу прапанаваць перагледзець правілы бязвыплатнай і льготнай перадачы такім арганізацыям маёмасці — з мэтай выплаты імі дзяржаве поўнага кошту атрыманай маёмасці, — сказаў **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанід КОЗІК**.

Кіраўнікі прафсаюзнага руху абмеркавалі вынікі рэспубліканскай нарады па будаўніцтве і кадравых пытаннях, якую 10 снежня правёў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Леанід Козік заявіў:

— Прафсаюзы падтрымліваюць пазіцыю кіраўніка дзяржавы ў пытаннях неабходнасці навядзення парадку ў будаўнічай галіне, скарачэння выдаткаў на праектныя і агульнабудаўнічыя работы, тэрміновага завяршэння ўводу ў строй праблемных жылых дамоў. Адпаведным прафсаюзным камітэтам даручана ўзяць пад кантроль завяршэнне будаўніцтва праблемных жылых дамоў і своечасовы ўвод іх у строй, стварыўшы прафсаюзныя камісіі.

У сваю чаргу ўпраўленне капітальнага будаўніцтва апарата Савета ФПБ плануе правесці дэталёвы аналіз і кантроль своечасовага якаснага выканання рамонтна-будаўнічых работ на аб'ектах, падведамных федэрацыі, забяспечыўшы скарачэнне выдаткаў на іх завяршэнне.

Таксама сур'ёзныя пытанні ў прафсаюзаў ФПБ выклікалі выпадкі ўвядзення скарочанага працоўнага дня, працоўнага тыдня, вымушаныя адпачынкі работнікаў, затрымкі і спробы пераносу тэрмінаў выплаты зарплаты, новы парадак разліку па бальнічных лістах і дыскрэдытацыя па прафсаюзнай прыкмеце.

Была абмеркавана рэальная сітуацыя ў прафсаюзным руху краіны і прыняты рашэнні па далейшым яго развіцці.

**Святлана БУСЬКО**

■

Каця ІЎЛІЕВА:

ТВ@Р

# «ЗАЎСЁДЫ КАЖУ ТОЛЬКІ ТОЕ, ШТО ДУМАЮ»

**Шчырасць, адкрытасць і самакрытыка — пазіцыя Каці Іўліевай у эфіры радыё «Мір», у асабістым жыцці і на сцэне, дзе яна выступае як Каця Оўшэн. Музыка — яе стыхія, датычыцца гэта дзённага трохгадзіннага «Міравога эфіру», вячэрняй праграмы па пятніцах і суботах «Міравая танцпадлога» або выступленняў, нават калі гэта рэпетыцыя дома, якую чуюць толькі суседзі. Мы сустракаемся з Кацяй пасля дзённага эфіру. Я з першай хвіліны адчуваю яе пазітыў. Здаецца, нібыта яна забегла павітацца і зараз зноў «паляціць» па справах. Акідваю вокам суразмоўцу і чамусьці ўзнікае думка: нешта не так?.. Аказваецца, дзяўчына проста перафарбавала валасы... Вось яно, пацвярджэнне схільнасці да эксперыментаў.**



***— Адчуваеце перамены з новым колерам валасоў?***

— Колер кардынальна змяняе адчуванні і ўспрыманне цябе іншымі. Людзі з цёмнымі валасамі атаясамліваюцца з сур'ёзнасцю, хаця ўнутрана я застаюся такой, як і была раней: лёгкай, актыўнай і пазітыўнай. Пра сур'ёзныя рэчы я, безумоўна, задумваюся, бо ёсць імкненне да перамен у жыцці. Так заўсёды адбываецца, што чалавек, змяняючы нешта ў знешнасці, натуральна настройваецца на нешта новае. І мне гэта імпануе.

***— У якіх жа сферах чакаць перамен?***

— Яны будуць усюды: як у асабістым жыцці, так і ў творчай сферы. Аднак, калі гаварыць пра радыё, то, думаю, тут кардынальных перамен не прадбачыцца. Бо я імкнуся ўвесь час здзіўляць нечым сваю аўдыторыю, штодзённа працаваць над памылкамі і рухацца далей. Раскрываць сакрэты пакуль што не хацелася б.

***— Атрымліваецца, усё ж даводзілася сутыкацца са стэрэатыпамі пра бландзінак?***

— Са зменай колеру валасоў я на сабе адчула: людзі вакол сталі ўспрымаць мяне па-іншаму. Раней даводзілася пастаянна даказваць, што на вынік маёй працы знешнасць не ўплывае. Не заўсёды ўдавалася адразу пераканаць. А зараз, мне здаецца, у гэтым сэнсе стала значна прасцей. Кардынальна перафарбоўвацца не стала, бо мне блізкая цёплая гама, я і ўнутры такая ж. Упускаю ў сваё жыццё ўсіх, нават калі даводзіцца наступаць на граблі. У гэтым мая існасць. Што б я ні рабіла, імкнуся рабіць шчыра. Я нават заўсёды кажу толькі тое, што думаю. Разумею, што людзям сказанае можа не падабацца ці яны мяне няправільна зразумеюць. Але крывадушнасць не па мне.

***— Якія якасці вы цэніце ў стаўленні людзей да вас?***

— Перш за ўсё — павагу. Прычым гэта датычыцца любой сітуацыі ў жыцці. Мне важна таксама, каб людзі ўмелі адэкватна рэагаваць і ацэньваць. Часам сустракаеш на сваім шляху і тых, хто, прыкрываючыся добрымі намерамі, можа парушыць твае планы. Таму добра, калі чалавек умее ацэньваць у іншых перспектыву. Я нармальна стаўлюся да крытыкі, парад і рэкамендацый. Калі выказваюць канструктыўныя заўвагі, спрабую перагледзець сітуацыю, змяніць яе ў лепшы бок. Усе ж мы не ідэальныя. Словам, «мае» людзі — шчырыя, праўдзівыя і ў нечым самакрытычныя.

***— Якія недахопы ёсць у вас?***

— Я вельмі няўседлівая і нецярплівая. Кожны раз, калі гэтыя якасці праяўляюцца ўва мне, імкнуся іх перамагчы. Напрыклад, бывае так: адкладваеш нейкую справу ўвесь час, а потым у апошні момант садзішся і ўсё робіш. І вось у такіх сітуацыях да позняй ночы сядзіш, але даводзіш распачатае да канца. Мая адказнасць перакрывае гэты недахоп. Таксама я вельмі хутка ўскіпаю. Але, калі пачынаю заўважаць у сваіх паводзінах такія адценні то адразу ж імкнуся думаць рацыянальна. Супакойваю сябе і спыняюся, альбо тактоўна пераходжу на іншую тэму. Мне здаецца, сваю ролю адыгрывае яшчэ і тое, што па знаку задыяка я Шалі. Таму не абыходзіцца без настойлівасці і ўпартасці. Прытым, я ніколі не буду спрачацца да апошняга, калі на сто працэнтаў не ўпэўнена ў сваёй слушнасці.

***— Для раўнавагі вам што патрабуецца?***

— Для мяне па жыцці не характэрны баланс. Я знаходжуся пастаянна ў руху, дзе вышыня змяняецца прызямленнем. Хоць людзі ў большасці сваёй імкнуцца да балансу, у маім выпадку няма жадання яго дасягнуць, бо мне не цікава плыць па цячэнні. Раўнавага для мяне мае значэнне хіба што ў асабістым жыцці, а ў творчасці мной рухае супярэчлівасць.

***— Вы сёння можаце сказаць, што займаецеся любімай справай?***

—У гэтым плане я самы шчаслівы чалавек, бо маю магчымасць займацца тым, што мне вельмі падабаецца. Я працую дыджэем на радыё, сама ствараю музыку. Такі сабе двайны прыліў драйву. Узяць, напрыклад, праект «Міравая танцпадлога». Там я кожны тыдзень адсочваю навінкі ў свеце музыкі. Калі казаць пра мой сольны праект Каця Оўшэн, дзе я пішу музыку і выконваю яе, то тут ёсць да чаго імкнуцца. Але галоўнае — што мая сфера дзейнасці прыносіць задавальненне і хочацца ўвесь час нешта прыдумляць і развівацца.

***— Як трапілі на радыё «Мір»?***

— Гэта быў перыяд пераходу з аднаго месца працы на іншае. Нармальная практыка сярод дыджэяў. Мне патэлефанавалі, я прайшла гутарку і цяпер працую тут. Таму, можна сказаць, радыё само знайшло мяне.

***— А наогул калі-небудзь марылі працаваць на радыё?***

— У дзяцінстве не было жадання стаць дыджэем ці радыёвядучай. Па волі выпадку я трапіла ў гэтую нішу. Я скончыла Універсітэт культуры па спецыяльнасці «Рэжысура святаў». Аднойчы мне патэлефанаваў аднакурснік і прапанаваў паспрабаваць сябе ў амплуа радыёвядучай. На той момант я была на адпрацоўцы ў адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска ў аддзеле культуры. Толькі ўявіце: офіс — паперы, дакументацыя — для творчага чалавека нялёгкае выпрабаванне (зрэшты, вопыт усё ж такі набыла там карысны). Таму перавесціся на радыё было ўдачай. Шчыра прызнаюся, першыя месяцы ўвесь эфір распісвала на паперы. Адыходзіць ад прапісаных тэкстаў дазваляла сабе хіба што ў віншаваннях... Паверце, працаваць даводзілася не менш чым тым, хто марыць пра радыё ўсё жыццё. Да прыходу на радыё «Мір» я папрацавала на розных радыёстанцыях і вядучай, і нават на пасадзе праграмнага дырэктара. І вось цяпер я ўжо 1,5 года тут.

***— Што важна ўлічваць чалавеку, які хоча быць радыёдыджэем?***

— Адзін з галоўных пунктаў — добра разбірацца ў сучаснай музыцы. І не мае значэння, хто займаецца плэй-лістом: ты ці музычны рэдактар. Таксама важна ўмець кіраваць эфірным працэсам. Я, напрыклад, ад працы «за пультам» атрымліваю проста каласальнае задавальненне. Спадзяюся, і аўдыторыі яно перадаецца. Наогул, трэба быць у курсе ўсяго, што адбываецца ў свеце. Дыджэй павінен умець дзяліцца сваім жыццёвым вопытам, каб да месца пажартаваць у праграме альбо расказаць нейкае здарэнне з жыцця, якое прымусіць слухача задумацца. Калі дзелішся з аўдыторыяй пачуццямі, то гэта вас збліжае. Самае галоўнае — быць пры любых умовах самім сабой, бо гульня на публіку лёгка распазнаецца і ў нейкім сэнсе нават адштурхоўвае.

***— Праца ў эфіры патрабуе немалых эмацыянальных затрат. Як аднаўляецеся?***

— У эфіры ўсё люблю рабіць самастойна. Бо лічу, я лепш адчуваю свой настрой, месцы, калі трэба выводзіць сябе ў эфір. Гэта ж часам літаральна долі секунды, а на ўспрыманні адлюстроўваецца. Таму за ўсё — ад звядзення трэкаў і да выпуску навін — мне хочацца адказваць самой. Засяроджанасць на працэсе, як вы заўважылі, патрабуе ў тым ліку і эмацыянальных выдаткаў. Бывае так, што пасля праграмы я яшчэ па дарозе дадому працягваю адчуваць тэмпарытм мінулага эфіру. У мяне няма такога, каб я выйшла і разняволілася. Толькі недзе праз гадзіну я больш-менш супакойваюся. Каб аднавіцца, мне трэба нейкі час проста памаўчаць. Так я настройваюся на далейшыя дзеянні і планы на дзень.

***— У дзяцінстве вы марылі быць знакамітай. Уяўленне аб папулярнасці спраўдзілася?***

— Да папулярнасці стаўлюся вельмі спакойна. Не магу сказаць, быццам дасягнула нейкіх вышынь, каб лічыць сябе «зоркай». У дзяцінстве ж марыла, як і многія пра тое, каб кветкі дарылі, аўтографы бралі... А з узростам па-іншаму ўспрымаеш поспех. Папулярнасць любой цаной мяне не цікавіць. Сёння мне хочацца працаваць на ўзроўні і адчуваць аддачу аўдыторыі!

**Алена ДРАПКО.**

**P.S.** *«Міравы эфір з Кацяй Іўліевай» слухайце з панядзелка па пятніцу з 10:00 да 13:00 на радыё «Мір». Анонс перадач, а таксама навіны глядзіце на radiomir.by.*

## ■ Перадсвяточнае «меню»

# ТАК І З'ЕЎ БЫ!

## АТН накрые стол «у савецкім стылі»

**Што агульнага паміж рыжскімі шпротамі і селядцом івасі, «Савецкім шампанскім» і «Кіеўскім» тортам, плаўленым сыркам «Дружба», шакаладам «Алёнка» і марозівам за 20 капеек? Усё гэта — харчовыя сімвалы Савецкага Саюза, якія займалі пачэснае месца ў святочным і паўсядзённым меню мільёнаў грамадзян вялікай краіны...**



Фота: прэс-служба БТРК.

Потым гэтыя прадукты зніклі з прылаўкаў савецкіх гастраномаў, дый самі гастраномы не вытрымалі нашэсця супермаркетаў. Але настальгія па «тым самым» смаку засталася. Узгадаць яго беларусам дапаможа праект Агенцтва тэленавін «Лёс гігантаў-2» пад кодавай назвай «Гастраном».

Першы праект «Лёс гігантаў» з поспехам прайшоў не толькі ў Беларусі, атрымаўшы па выніках 2012 года Гран-пры ў прафесійным конкурсе «Тэлевяршыня». Дакументальным цыклам гісторый пра ўзлёт і падзенне найбуйнейшых прадпрыемстваў і марак СССР (Саратаўскі авіязавод, «Булгартытунь», «Уралмаш», «РАФ», матацыклы «Ява», аўтобусы «Ікарус» і шмат іншых) зацікавіліся і ў Расіі, дзе шэраг рэгіянальных тэлеканалаў набыў правы на яго паказ.

— Мы доўга думалі, пра што яшчэ з савецкага мінулага можна распавесці. А тэма ляжала на паверхні. Аднойчы нехта з маскоўскіх калег сказаў: «Якая смачная ў вас каўбаса — як савецкая!» — прыгадвае кіраўнік АТН Кірыл Казакоў. — Мы зачапіліся за гэтую фразу і вырашылі зрабіць 10-серыйны цыкл пад агульнай назвай «Гастраном» — пра вядомыя калісьці прадуктовыя савецкія брэнды і пра тое, што ад іх засталося цяпер.

**1.00** Серыял «Быць чалавекам».

### ТБ1000

**5.00** Фэнтэзі «Уладар пярсцёнкаў. Вяртанне Караля».
**8.35** Драма «Закаханыя».
**10.20** Драма «Чорнае золата».
**12.45** Трылер «Харошы немец».
**14.40** Драма «Неўтаймоўныя сэрцы».
**16.45** Драма «Олівер Твіст».
**19.10** Камедыя «Па версіі Барні».
**21.30** Трылер «Дзяўчына з вады».
**23.25** Трагікамедыя «Моцная жанчына».
**1.45** Камедыя «Браты Саламон».
**3.20** Трылер «Тайнае акно».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**5.40** Драма «Год сабакі».
**8.00** Камедыя «Чорны баран».
**10.00** Камедыя «Ноч зачыненых дзвярэй».
**12.00** Драма «Мілы, дарагі, любімы, адзіны...».
**13.30** Драма «Збавенне».
**16.00** Камедыя «У чаканні цуду».
**18.00** Камедыя «Дзед Мароз заўсёды звоніць... тройчы!».
**20.00** Камедыя «Тарыф Навагодні».
**21.50** Драма «Адмірал».
**0.00** Драма «Юнкеры».
**2.50** Камедыя «Дачка якудзы».
**4.25** Меладрама «Байкер».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 11.00, 21.00, 1.00, 4.00** Аферысты і турысты.
**6.00, 16.00** Каралі рыбалкі.
**7.00** Паляванне на рачную пачвару.
**8.00, 13.00** Скарбашукальнікі.
**9.00, 14.00** Золата Юкана.
**10.00** Страчаныя дзённікі Дэвіда Лівінгстона.
**12.00** Гульні розуму.
**15.00** Тайна марскога д'ябла.
**17.00, 2.00** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
**18.00** Стараццелі.
**19.00** Зусім сакрэтна.
**20.00, 3.00** Выратавальны атрад.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Хлопцы з Юкана.
**7.50, 12.20, 3.05** Майстры выжывання.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 17.20** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**10.30, 0.00** Як устроены Сусвет.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**13.15, 5.10** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**14.10, 6.05** Махінатары.
**15.05** Махінатары на трасе.
**15.30** Зброя па-амерыканску.
**16.25** Паўночная Амерыка.
**18.15** Як устроена Зямля.
**19.10** Пяцёрка лепшых.
**21.00** Патрык Дэмпсі ў гонцы Ле-Мана.
**22.00** Каралі сутыкненняў.
**23.00** Мотарэстаўрацыя.
**0.55** Top Gear.
**1.50** У турме і на чужыне.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ПАД АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ ПАТРАПЯЦЬ... КВЕТКІ

**Напярэдадні святочных мерапрыемстваў Міністэрства гандлю звярнулася да гандляроў кветкамі з напамінам абавязкова выконваць патрабаванні заканадаўства адносна абароны правоў спажыўцоў і правілаў вядзення рознічнага гандлю.**



Фота Пятра ФАМІНА.

Міністэрства звярнула ўвагу суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці, якія рэалізоўваюць кветкавую прадукцыю, на неабходнасць абавязковай наяўнасці цэннікаў з указаннем тавару, цаны, краіны паходжання і г. д.

У неабходным аб'ёме таксама да спажыўцоў павінна даводзіцца інфармацыя аб правілах і ўмовах эфектыўнага і бяспечнага выкарыстання кветкавай прадукцыі, якая рэалізуецца, у тым ліку па доглядзе яе. Інфармацыя павінна быць дакладнай, даводзіцца ў даступнай форме на беларускай ці рускай мове. Суб'екты гаспадарання таксама павінны размяшчаць на сваіх гандлёвых аб'ектах шыльды з указаннем свайго наймення, рэжыму працы, а таксама забяспечыць прадаўцоў нагруднымі знакамі.

Упраўленне кантролю спажывецкага рынку — гандлёвая інспекцыя Міністэрства гандлю ў бліжэйшы час плануе надаць пытанню захавання правілаў гандлю і патрабаванням заканадаўства адносна абароны правоў спажыўцоў пры рэалізацыі суб'ектамі прадпрымальніцкай дзейнасці кветак і кветкавай прадукцыі асаблівую ўвагу.

## ЗБІРАЕЦЕСЯ Ў ДАРОГУ? ЗВЕРЦЕСЯ З РАСКЛАДАМ

**Стала вядома, як будуць выконвацца рэгулярныя рэйсы па міжгародніх маршрутах, якія абслугоўваюцца дзяржаўным прадпрыемствам «Мінсктранс» у перадсвяточныя і святочныя зімовыя дні.**

Гаворка ідзе пра перыяд з 31 снежня гэтага года па 7 студзеня наступнага, а таксама пра 25 снежня. Так, 25 снежня рэгулярныя рэйсы па міжгародніх маршрутах будуць выконвацца па раскладзе будных дзён (серады), 31 снежня — па раскладзе пятніцы.

1 і 3 студзеня рэйсы будуць выконвацца па раскладзе будных дзён (серады), 2 і 7 студзеня — як у нядзельныя дні, 4 студзеня — па раскладзе пятніцы. 5 і 6 студзеня транспарт будзе абслугоўваць пасажыраў, як па суботніх днях. Плануючы падарожжа, варта папярэдне зазірнуць у расклад руху, каб удакладніць інфармацыю, што датычыць адносна перанесеных і адмененых рэйсаў 31 снежня і 1 студзеня.

## УГНАЎ... СНЕГАПРЫБІРАЛЬНУЮ МАШЫНУ

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Маскоўскага РУУС сталіцы разам з калегамі з упраўлення крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама затрымалі 58-гадовага мінчаніна, які ўчыніў згон снегапрыбіральнай аўтамашыны «МАЗ».**

Як толькі стала вядома пра здарэнне на вуліцы К. Лібкнехта, туды тут жа выправілася следча-аператыўная група. Высветлілася, што машына, якая належала камунальнікам, была прыпаркавана на ўзбочыне. Неўзабаве сышчыкі ўстанавілі ўсе абставіны знікнення транспартнага сродку, у тым ліку — асобу згоншчыка. Затрымалі яго ў адной з вёсак Салігорскага раёна, там жа быў знойдзены і «МАЗ». Мужчына, дарэчы, перыядычна любіў прыняць «за каўнер». Дзеяннем зламысніка даецца прававая ацэнка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## КАНТРАБАНДА ПЛОМБЫ ДЛЯ ЗУБОЎ

**36-гадовы жыхар Ленінградскай вобласці, які ехаў у Беларусь з Украіны цягніком «Адлер — Мінск», адмовіўся запаўняць пасажырскую мытную дэкларацыю ў пункце пропуску «Церуха». Ён заявіў, што не вязе нічога, што трэба дэклараваць.**

Аднак падчас мытнага агляду багажу ў грамадзяніна выявілі $15 700, якія, у адпаведнасці з мытным заканадаўствам, падлягалі абавязковаму пісьмоваму дэклараванню. Усё, што звыш $10 000, мытнікі канфіскавалі. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскай мытні, у тым жа пункце пропуску мытнікі канфіскавалі ў аднаго з пасажыраў цягніка «Санкт-Пецярбург — Кіеў» стаматалагічныя тавары на суму Br250 млн. Ён таксама адмовіўся ад дэкларавання. У выніку ў яго багажы знайшлі расходныя матэрыялы для стаматалогіі, імплантаты і прылады — усяго 758 штук. Па факце гэтых правапарушэнняў завялі адміністрацыйныя справы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## «ЗА АБСЛУГОЎВАННЕ ЛЕГКАВОГА АЎТАМАБІЛЯ — ДАДАТКОВАЯ АПЛАТА Ў ПАМЕРЫ ТАРЫФНАЙ СТАЎКІ»

**У рэдакцыю газеты па нашай «гарачай лініі» патэлефанавала Ніна Аляксееўна Бярозка, якая пражывае ў вёсцы Любушаны Бярэзінскага раёна. Пытанне датычылася яе мужа Мікалая Мікалаевіча Цэдрыка, з якім, паводле слоў заяўніцы, не да канца разлічыліся (маецца на ўвазе заработная плата).**

— Ён працаваў у філіяле «Купава-Агра». Па кантракце — кіроўцам службовага легкавога аўтамабіля. Аднак фактычна на лета мужа пераводзілі на іншую працу: на трактары ён касіў траву, на спецыяльнай машыне «Раса» ўносіў угнаенні. Нягледзячы на гэта, адначасова муж павінен быў даглядаць і замацаваную за ім службовую легкавую машыну, на якой у гэты час не ездзіў: мыць, запраўляць яе, рамантаваць. І вось менавіта за гэтую працу з ім цалкам не разлічыліся. За чэрвень заплацілі 400 тысяч рублёў, а за ліпень увогуле нічога не далі. Муж звольніўся 13 жніўня гэтага года па ўзгадненні бакоў, — давodзіла нам Ніна Аляксееўна.

З просьбай праверыць выкладзеныя факты і пры неабходнасці прыняць адпаведныя меры па выпраўленні сітуацыі мы звярнуліся да **начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Бярэзінскага райвыканкама Яўгена КРУКОВІЧА.**

Праз пэўны час атрымалі афіцыйны адказ наступнага зместу.

«Спецыялісты ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Бярэзінскага раённага выканаўчага камітэта запрасілі ў работнікаў філіяла «Купава-Агра» інфармацыю адносна налічэння заработнай платы Мікалаю Мікалаевічу Цэдрыку за чэрвень-ліпень 2013 года. Згодна з прадастаўленымі данымі, Цэдрык М. М. адпрацаваў у філіяле ў якасці трактарыста-машыніста ў чэрвені 27 дзён (254 гадзіны) і ў ліпені — 23 дні (194 гадзіны).

Сапраўды, у гэты час па меры неабходнасці ён прыцягваўся да працы па мыйцы і абслугоўванні легкавога аўтамабіля, за што і праведзена дадатковая аплата ў памеры тарыфнай стаўкі. Фактычнае налічэнне зарплаты Цэдрыку М. М. за чэрвень склала 7 725 682 рублі, у тым ліку за мыйку і абслугоўванне легкавога аўтамабіля — 493 665 рублёў, у ліпені налічэнне склала 3 710 560 рублёў, у тым ліку за абслугоўванне легкавога аўтамабіля даплачана 488 235 рублёў».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Здаровае харчаванне

# ЗА ШТО МЫ ЛЮБІМ «КАРОЎКУ»?

**Крыху салодзенькага — толькі на карысць. Асабліва калі менавіта крыху і калі салодзенькае, так бы мовіць, правільнае. Напрыклад, малочныя цукеркі «Кароўка». Іх выпускаюць не толькі айчынныя вытворцы, але і замежныя. Спажывец жа павінен дакладна ведаць, што паміж «кароўкамі» бывае розніца. Выробленая на ААТ «Чырвоны Мазыранін» — сапраўдная, з натуральнай сыравіны.**

Наогул зефір, мармелад і тая ж «Кароўка» — прысмакі, пры вырабе якіх выкарыстоўваецца шмат ручной працы. Як вядома, галоўным складнікам «каровак» з'яўляецца цэльнае згушчанае малако з цукрам. У цвердаватую аснову дадаецца яшчэ крухмал. У паглыбленне такой асновы заліваецца вадкаватая начынка-«цягнучка». Для гэтага працэсу цалкам непажаданае механічнае ўздзеянне. «Адліванне» малочных цукерак патрабуе ў прамым сэнсе пяшчотных рук і... А вось чаго яшчэ — не могуць патлумачыць нават тэхнолагі! На прадпрыемстве кажуць, што «цягнучка» неабавязкова павінна цягнуцца, хоць менавіта гэтага і чакае той, хто імі ласуецца. Штораз усё робіцца паводле адной «формулы», але нейкая партыя «цягнецца», застаецца вадкай, а другая — крышталізуецца амаль тут жа. А ў рэшце рэшт дзён праз пятнаццаць пасля вырабу зацукроўваецца любая «Кароўка».



Праўда, у некаторых імпартных аналагах такога працэсу не назіраецца. Колькі ні захоўвай, яны ўсё мяккія ды цягнуцца. Сакрэт просты: для дасягнення падобнага эфекту вырабнік выкарыстаў нямала не вельмі карысных дабавак.

Жыхары невялікага горада Нароўля, дзе вырабляецца «Кароўка» а-ля нацюрэль, дакладна ведаюць, што шмат гадоў таму нехта прыдумаў такія цукеркі з-за любові да згушчанага малака. Тут нават разважаюць над усталяваннем помніка рагулі.

На жаль, «Чырвонаму Мазыраніну», прадпрыемству—роданачальніку вытворчасці класічнай «Кароўкі», не ўдалося запатэнтаваць гэтую назву, і таму цяпер на блізказамежныя рынкі пастаўляецца нараўлянская «Шчодрая Кароўка». Ёсць яшчэ «Макавая расінка» (насамрэч «Кароўка» з макам), «Кароўка з карыцай», «Свирель» (глазураваная «Кароўка»).

Гісторыя самой фабрыкі пачалася з 1913 года, калі яе заснаваў мясцовы памешчык Горват для перапрацоўкі фруктаў і гародніны са сваіх іменняў. Пасля рэвалюцыі фабрыку нацыяналізавалі, а грамадзянская вайна прывяла да поўнага разбурэння прадпрыемства. У 1925 годзе фабрыку аднавілі мазырскія рабочыя, з-за чаго яна і атрымала адпаведную назву. У тым жа годзе была выпушчана першая прадукцыя — цукеркі, ірыс, павідла, джэм, пасціла, мармелад, зефір. У 1996 годзе Нараўлянская кандытарская фабрыка была ператворана ў ААТ «Чырвоны Мазыранін».

— Мы выкарыстоўваем экалагічна чыстую, натуральную сыравіну з краін блізкага і далёкага замежжа. Выпускаем сёння больш за 100 найменняў кандытарскіх вырабаў— цукеркі малочныя і памадныя, у шакаладнай і кандытарскай глазуры, зефір, пасцілу, мармелад, ірыс, — расказала дырэктар ААТ «Чырвоны Мазыранін». — Адзіныя выпускаем глазураваны зефір «Загадкавы» — арыгінальныя цукеркі на палачцы з водарам кавуна, персіка, ванілі і клубніц.

У планах — выраб шакаладу. Ад малочнага да горкага і дэсертнага. А вось з дня на дзень работнікі фабрыкі мяркуюць парадаваць спажыўца шакаладнымі цукеркамі з лікёрнай начынкай.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Крымінал

## НЕ ЗМАГЛА ЎТРЫМАЦЦА АД СПАКУСЫ

**Работніца сельгаспрадпрыемства ўкрала са службовага сейфа каля 100 млн рублёў.**

У пачатку снежня ў праваахоўныя органы звярнуўся начальнік сельскагаспадарчага прадпрыемства «Дземіхоўскі», што ў Рэчыцкім раёне. Ён паведаміў, што з сейфа касы знікла каля 100 мільёнаў рублёў. На месца адразу ж выехала следча-аператыўная група. Высветлілася, што ў пятніцу касір разам з галоўным бухгалтарам атрымалі ў адным з банкаў буйную суму «зарплатных» грошай. У той жа дзень атрымаць зарплату ўсе работнікі не паспелі. Пасля выхадных, раніцай у панядзелак, касір паведаміла кіраўніку прадпрыемства непрыемную навіну: маўляў, нехта ўзламаў дзверы касы і выкраў з сейфа грошы.

Праваахоўнікі пачалі расследаваць крымінальную справу па факце крадзяжу ў буйным памеры. Пэўную насцярожанасць, паводле слоў начальніка аддзялення УУР Гомельскага УУС Паўла Шведава, адразу ж выклікала тое, што абсалютна ніякіх прыкмет узлому не было: дзверы касы і сейфа былі адчынены штатным ключом.

Пад падазрэнне адразу ж трапіла касір прадпрыемства. 20-гадовая дзяўчына летась скончыла Гомельскі аграрна-эканамічны каледж і ўладкавалася працаваць на сельгаспрадпрыемства бухгалтарам. За некалькі тыдняў да «крадзяжу» яе прызначылі касірам.

Праваахоўнікі высветлілі, што выхадныя касір правяла ў Гомелі. Прычым зняла кватэру на суткі, куды запрасіла сваіх знаёмых і сяброў у госці. Грошай на адпачынак не шкадавала. Паспела таксама набыць некалькі рэчаў... Адмаўляць відавочнае не было сэнсу, і касір прызналася ва ўсім. Вось толькі матыў злачынства аказаўся неверагодна банальным. Дзяўчына кажа, што скончыла ў той дзень працу, глянула на пачкі грошай у сейфе і... не змагла ўтрымацца ад спакусы. Таму і прыняла рашэнне зымітаваць крадзеж.

Украдзеную сума касір вярнула ў поўным аб'ёме. І вяскоўцы нарэшце атрымалі зарплату. А следчыя органы перакваліфікавалі крадзеж на ч.3 артыкула 211 КК (прысваенне або растрата маёмасці асобай, якой яна даверана, у буйным памеры).

**Надзея ПАЎЛАВА, Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## АФЕРЫСТКА ЗДАЛА Ў НАЁМ... ЧУЖУЮ КВАТЭРУ

**45-гадовая жанчына, якая нідзе не працуе, здымаючы кватэру ў Гродне, перад ад'ездам на новае месца жыхарства вырашыла на ёй... падзарабіць.**

Яна падала аб'яву ў газету аб здачы кватэры, на якую адгукнулася студэнтка адной з ВНУ. Пры гэтым дзяўчына заплаціла за 3 месяцы наперад — амаль 600 долараў. Сапраўдная гаспадыня кватэры даведалася аб незнаёмцы, якая там пасялілася, ад суседкі. А аферыстка, узяўшы грошы за чужое жыллё, з'ехала ў Арменію. Цяпер яе шукаюць праваахоўнікі, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Першае ў Беларусі

## ГАНАРОВАЕ КОНСУЛЬСТВА УКРАІНЫ АДКРЫЛАСЯ Ў ГРОДНЕ

Гэта зроблена з мэтай паглыблення эканамічных, культурных і турыстычных сувязяў паміж нашымі дзяржавамі. На думку Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Украіны ў Беларусі Міхаіла Ежаля, ёсць усе магчымасці для росту тавараабароту, які сёння перавышае 7,5 мільярда долараў. Дыпламатычная місія размясцілася ў цэнтры горада над Нёманам па вуліцы Замкавай, 7. Ганаровым консулам стаў вядомы гродзенскі бізнесмен, старшыня «Контэ Спа» Валянцін Байко. У гэтага прадпрыемства, дарэчы, ёсць прадстаўніцтва ва Украіне, дзе яго прадукцыя карыстаецца вялікім попытам. Валянцін Байко перакананы, што праца консульства абавязкова будзе карыснай для абедзвюх краін.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**ООО «Белпродоптторг»**, УНП 191102927,
*г. Минск, ул. Шаранговича, 19, к. 726*
**Утерянный пакет документов:** Свидетельство о регистрации, Устав, печать предприятия **считать недействительными с 01.07.2013 г.**

**ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома**

| | |
|---|---|
| 1. Дата, время, место проведения аукциона: **17 января 2014 года, в 15.00, в здании Великодолецкого сельского Дома культуры, ул. Лесная, 2а.** | |
| 2. Адрес участка | **Участок № 1: д. Замошье, 35 А Великодолецкого сельсовета Ушачского района** |
| 3. Площадь участка | **0,1465 га** |
| 4. Кадастровый номер | **224980705601000041** |
| 5. Начальная цена | **15 000 000 рублей** |
| 6. Шаг аукциона | **2 000 000 рублей** |
| 7. Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: **Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1б, в рабочие дни с 9.00 до 16.00 с 14.12.2013 по 15.01.2014 включительно** | |
| 8. Размер задатка — **1 500 000 рублей**, вносится на расчетный счет: *Великодолецкий сельский исполнительный комитет, 3641328011094 в ф-ле № 216 ОАО «СБ «Беларусбанк» г. Полоцк, код 150801648, УНП 300007086, ОКПО 28677750* | |
| 9. Адрес и номер контактного телефона: **Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1б, Великодолецкий сельисполком, 8 02158 23323, 23338, в рабочие дни с 8.00 до 16.00.** | |

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении 30 декабря 2013 года повторных торгов по продаже конфискованного имущества**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование продаваемого имущества)** | **Самолёт «CESSNA CITATION X»*, девятиместный, с двумя турбореактивными двигателями, серийный номер 750-0300, регистрационный номер OE-HAK, 2009 год выпуска, цвет белый с красным.** |
| **Начальная цена** | 46 956 000 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 4 600 000 000 белорусских рублей |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22 |

* *Имущество реализуется без эксплуатационной (технической) документации.*

Местонахождение продаваемого имущества – территория аэропорта «Минск-1».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **30 декабря 2013 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 13.12.2013 по 26.12.2013 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017) 327-40-22; (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»
220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2013 г.**

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2013 год | 2012 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1928528,5 | 1994321,9 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 9380,7 | 9241,7 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 13787874,0 | 19684061,8 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5179017,9 | 3596345,4 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 15513394,5 | 11635470,6 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 107362047,6 | 85063875,1 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 4227763,1 | 3872209,6 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | 99620,4 | 79089,9 |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 6183,5 | 4837,5 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 4358559,1 | 4047403,8 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 3500,5 | 299,8 |
| 14 | Деловая репутация | | - | - |
| 15 | Прочие активы | 1111 | 1124653,9 | 907659,7 |
| 16 | ИТОГО активы | 11 | 153600523,7 | 130894816,8 |
| 17 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 18 | Средства Национального банка | 1201 | 3496630,2 | 6708107,2 |
| 19 | Средства банков | 1202 | 20474532,5 | 13755231,3 |
| 20 | Средства клиентов | 1203 | 96551338,9 | 78941748,9 |
| 21 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 8728673,9 | 8705042,5 |
| 22 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 958,8 | 272,9 |
| 23 | Прочие обязательства | 1206 | 1749334,1 | 1466309,4 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 131001468,4 | 109576712,2 |
| 25 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 16187552,6 | 16187552,6 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | 98,1 | 98,1 |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 1063706,9 | 823633,8 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 2204518,2 | 2181231,0 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 3142772,0 | 2125188,1 |
| 31 | Всего капитал, принадлежащий головной организации-банку | | 22598647,8 | 21317703,6 |
| 32 | Доля неконтролирующих акционеров | | 407,5 | 401,0 |
| 33 | ВСЕГО капитал | 121 | 22599055,3 | 21318104,6 |
| 34 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 153600523,7 | 130894816,8 |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2013 года**

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2013 год | 2012 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 13597305,9 | 13428497,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 10396958,2 | 9940229,2 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 3200347,7 | 3488268,1 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1398002,5 | 1002729,6 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 448708,2 | 332966,4 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 949294,3 | 669763,2 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 1669,1 | 2482,9 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (5685,3) | (15152,8) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 209361,5 | 383824,7 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 362642,1 | 50363,6 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 592860,6 | 1646909,9 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 774268,7 | 1288026,2 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 2958705,6 | 2655520,0 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 516155,3 | 356237,2 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1424176,6 | 1208908,8 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 187476,3 | 187981,4 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1236700,3 | 1020927,4 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | 21456,0 | 13609,7 |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | - | - |
| 20 | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | 1258156,3 | 1034537,1 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | 1258149,8 | 1034537,1 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | 6,5 | - |

**Председатель Правления** **С.П.Писарик**

**Главный бухгалтер** **И.П.Лысоковская**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №№ 0745209–0745210 **считать недействительными**. УНП 101883943

**Два многоквартирных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне № 1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева**

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**УП «КАНИМИС» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства**

ЗАСТРОЙЩИК – ЧТУП «КАНИМИС»

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 3 апреля 2003 года №505, в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100856965.

Юридический адрес: г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 27, корп. 2, к. 28.

Почтовый адрес: г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, к. 1, телефон/факс +375173060802, +375173060781, режим работы: понедельник-пятница: с 9.00 до 18.00; выходные дни – суббота, воскресенье, обед с 13.00 до 14.00.

**Ранее реализованные проекты:** в настоящее время ведется строительство административного центра в квартале ул. К. Либкнехта и пер. Домашевский в г. Минске.

**Цель строительства** – исполнение инвестиционного проекта по договору № 239-Д на реализацию права проектирования и строительства объекта «Два многоквартирных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне № 1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева» от 18.05.2011 года с Минским городским исполнительным комитетом.

**Объект строительства** – два многоквартирных 16-этажных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне № 1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева.

Расположены в микрорайоне Сухарево в г. Минске.

Нормативная продолжительность строительства Объекта – 21 мес., ввод в эксплуатацию – IV квартал 2013 года.

**Застройщиком получены:**

- Решение Мингорисполкома от 12 июля 2012 года № 2218 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства».

- Свидетельство (удостоверение) № 500/727-8015 о государственной регистрации создания земельного участка площадью 0,0065 га, расположенного по адресу: г. Минск, в границах ул. Шаранговича – Горецкого – Рафиева; свидетельство (удостоверение) №500/727-8031 о государственной регистрации создания земельного участка площадью 0,6381 га, расположенного по адресу: г. Минск, в границах ул. Шаранговича – Горецкого – Рафиева.

- Экспертное заключение РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗЫ» от 22.12.2011 года № 1009-15/11.

- Разрешение Инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску № 2-208Ж-139/11 от 01.03.2013 г.

**Договор строительного подряда** № 26/12 от 26.12.2012 г. с ООО «СМУ-25», № 07/08-2012 с ООО «СК-12».

Жилые дома расположены в Фрунзенском районе г. Минска.

Жилые дома № 6 и № 7 запроектированы с теплым чердаком, плоской кровлей, пассажирским и грузопассажирским лифтом, встроенными административно-торговыми помещениями. Вентиляция в квартирах – естественная. Конструктивная схема зданий – монолитный каркас с заполнением поризованным кирпичом. Наружная отделка решена на основе применения современных отделочных материалов и конструкций.

Сведения о благоустройстве: озеленение, устройство дорожных покрытий, благоустройство прилегающей территории.

Этажность – 16. Площадь жилого здания – 6064,55 кв.м. Общая площадь квартир – 4833,5 кв.м.

Всего в доме № 7 – 77 квартир, из них для привлечения к строительству по договорам создания объектов долевого строительства дольщиков – **граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий**:

Однокомнатных общей площадью 44,60 кв.м – 1 квартира. Цена 1 кв.м – 13 885 872.

Все квартиры имеют летние помещения (лоджии).

Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков:

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, ненесущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию зданий.

Информацию по объекту долевого строительства и условиями заключения договоров можно получить в офисе УП «КАНИМИС» с 25.11.2013 года по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 10 – 1А. Телефон/факс: 8(017)3060802, 8(017)3060781 с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни: суббота, воскресенье.

■ Жамчужыны Айчыны

# У Залессі — назаўсёды

## СЯДЗІБА АГІНСКІХ АДНАЎЛЯЕЦЦА ДЗЯКУЮЧЫ НАМАГАННЯМ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАЕКТУ ТРАНСГРАНІЧНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Радавы маёнтак Агінскіх у Залессі на Смаргоншчыне, як і многія іншыя гістарычныя аб'екты, час не пашкадаваў, не пашчасціла яму пазбегнуць разбурэння і заняпаду. Але цяпер ансамбль былога палаца пачатку XIX стагоддзя ў чаканні знакавай падзеі: у сярэдзіне наступнага года павінны завяршыцца работы па аднаўленні сядзібнага дома, дзе, як лічыцца, Міхал Клеафас Агінскі напісаў свой славуты паланэз «Развітанне з Радзімай».**

**Важнасць гэтай справы разумеюць і наша дзяржава (на сёння з рэспубліканскага і абласнога бюджэту на аднаўленне выдзелена каля 14,5 мільярда рублёў), і міжнародная супольнасць. У рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва «Латвія—Літва—Беларусь» Смаргонскі райвыканкам сумесна з дырэкцыяй Тракайскага нацыянальнага парку ажыццяўляюць праект «Выкарыстанне гістарычных сядзіб і іх адаптацыя да сучасных культурных умоў» з агульным бюджэтам 575268 еўра. Беларуская частка праекта — 212 тысяч еўра са сродкаў Еўрапейскай камісіі і 25 тысяч еўра — з бюджэту Смаргонскага раёна.**

### Ад Марцыяна да Ірэніуша

Залессе стала ўладаннем роду князёў Агінскіх у першай палове XVIII стагоддзя, калі яго набыў прадзед Міхала Клеафаса — Марцыян Міхал Агінскі. Тады яно называлася Дзербы. Пазней маёнтак перайшоў да яго сына Тадэвуша Францішка, потым — да Францішка Ксаверыя Агінскага. Яго пляменнік, дыпламат, гісторык, пісьменнік і кампазітар Міхал Клеафас Агінскі прыехаў у Залессе з жонкай Марыяй Нery-Нагурскай. «28 красавіка 1802 года я пакінуў Пецярбург з намерам назаўжды пасяліцца ў вёсцы недалёка ад Вільні», — так будзе ён узгадваць пра шчаслівыя дні прыезду на радзіму продкаў. Новыя гаспадары засяліліся ў вялікі драўляны атынкаваны палац, пабудаваны яшчэ ў першай палове XVIII стагоддзя (да нашага часу ён не захаваўся), побач пачалі ўзводзіць новы, мураваны, а таксама двухпавярховы млын, аранжарэі і цяпліцы, капліцу. Праекціроўшчыкам быў прафесар архітэктуры Віленскага ўніверсітэта Міхал Шульц. Дапамагаў яму (а пасля смерці Шульца кіраваў усімі работамі) віленскі губернскі архітэктар Юзаф Пусэ.

Аднак у канцы 1822 года Міхал Клеафас па стане здароўя пакідае сваё любімае Залессе і пераязджае ў Фларэнцыю, якая і стала для яго апошнім прытулкам. У 1833 годзе маёнтак Залессе перайшоў у спадчыну яго сыну Ірэніушу, які жыў тут са сваёй маці, а пасля яе смерці перанёс радавую рэзідэнцыю Агінскіх у горад Рэтаў (тэрыторыя сучаснай Літвы). Ужо ў канцы XIX стагоддзя ў былых Паўночных Афінах (такую назву Залессе, дзе збіраліся выдатныя дзеячы той эпохі з Пецярбурга, Масквы, Парыжа, Варшавы, Вільні і іншых гарадоў, атрымала ад сучаснікаў Міхала Клеафаса) панаваў дух запусцення...

Сёння гэта помнік гісторыка-культурнай спадчыны (тэрыторыя сядзібы складае 25 гектараў), які ў 2009 годзе перададзены ва ўласнасць Смаргонскага раёна з дакументацыяй на рэстаўрацыю.

### Паркавыя рарытэты

...Шлях да сядзібнага дома, дзе цяпер праводзяцца будаўнічыя і рэстаўрацыйныя работы, пралягае праз старадаўнюю ліпавую алею, якая памятае конныя экіпажы гаспадароў маёнтка і іх гасцей. Побач засталіся рэшткі фундамента драўлянага палаца, а ў яго партэры быў французскі парк.

— Звярніце ўвагу на гэты насып і равок. Спачатку я не разумела, для чаго ён прызначаны. Аказваецца, для таго, каб на дарожках парку не стаяла вада, — расказвае **намеснік начальніка ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Смаргонскага райвыканкама Таццяна РАЖАВА.**

Другая паркавая частка была створана па ініцыятыве Міхала Клеафаса Агінскага ў папулярным на пачатку XIX стагоддзя англійскім стылі і задумвалася як маляўнічы куток дзікай прыроды. Там захавалася да нашых дзён паўкруглая альтанка ў рамантычным стылі пачатку XIX стагоддзя. Яна патрабуе рэстаўрацыі на наступным этапе аднаўлення палацава-паркавага ансамбля, а побач мяркуецца зрабіць невялікую пляцоўку для канцэртаў камернай музыкі.

Да паркавых рарытэтаў, вядома ж, адносяцца і ўстаноўленыя пры жыцці Міхала Клеафаса камяні з памятнымі надпісамі: адным ён ушанаваў свайго настаўніка Жана Ралея, а другі — у гонар Тадэвуша Касцюшкі. Адноўлена і дзейнічае капліца. А вось так званая кітайская альтанка з драўлянай галерэяй на другім паверсе, адкуль можна было назіраць за дзікімі жывёламі ў звярынцы, да нашых дзён, на жаль, не захавалася. Праўда, на гэтым месцы можна спыніцца падчас экскурсіі, бо краязнаўцы абазначылі яго камянямі.

**У адзін год, дарэчы, мясцовыя жыхары заўважылі, што лебядзінае патомства складаецца з сямі птушанят. Быццам сем нот для музычных твораў кампазітара, які жыў непадалёк...**

Спраў па розных кірунках на тэрыторыі сядзібы — непачаты край. Спецыялісты ў галіне паркавай культуры павінны зрабіць ацэнку сучасных, вельмі праблемных рэалій парку з планам дзеянняў па паляпшэнні яго стану. Неабходна рэстаўрацыя будынка млына. Трэба разбірацца, зноў жа на высокапрафесійным узроўні, з праблемамі водных аб'ектаў — рачулкі, што працякае праз парк, і возера-запруды з востравам, які здаўна называецца лебядзіным, і мастком, што злучае яго з сядзібай. І цяпер, як мы з Таццянай Ражавай пераканаліся, тут гняздуецца пара лебедзяў. У адзін год, дарэчы, мясцовыя жыхары заўважылі, што лебядзінае патомства складаецца з сямі птушанят. Быццам сем нот для музычных твораў кампазітара, які жыў непадалёк...

Верыцца, што на гэтыя і іншыя аб'екты ў перспектыве будуць скіраваны новыя праекты ў Залессі.

### І паркет — як у Агінскіх

Разам з **начальнікам упраўлення капітальнага будаўніцтва Смаргонскага райвыканкама Іванам ЛЫСКО** цікавімся, што робіцца па аднаўленні палаца. Генпадрадчык — Смаргонскі будаўніча-мантажны трэст № 41. Землякі Міхала Клеафаса Агінскага выконваюць практычна ўвесь спектр работ — агульнабудаўнічых, аддзелачных, сантэхнічных, электрамантажных. А «Белрэстаўрацыі» даверана ўстаноўка аконных і дзвярных блокаў індывідуальнага вырабу, укладка паркету, стылізаванага пад старажытныя ўзоры.

На жаль, пры ўсім жаданні палацу нельга вярнуць першапачатковы выгляд: з часоў Міхала Клеафаса Агінскага захавалася толькі адна з дзвюх аранжарэй — часовая, дзе зімавалі расліны, якія ўвесну выносіліся ў парк. Цяпер гэтае памяшканне (у гатычным стылі, з калонамі) плануецца выкарыстоўваць як выставачную залу. А ў другой аранжарэі, як і пры Агінскім, расліны павінны быць круглы год. Ужо цяпер трэба думаць, чым яе напоўніць і хто будзе тут гаспадарыць, ды не горш, чым садоўнік Міхала Клеафаса.

У адноўленым палацы будзе ствараца музейная экспазіцыя, прысвечаная Агінскаму. Прычым дзверы будуць адчынены не толькі для культурных імпрэз і экскурсій, але і для пражывання гасцей — у пакоях, разлічаных на 20 чалавек.

### Што паяднала Залессе і Ужутракіс?

Праектам трансгранічнага супрацоўніцтва «Выкарыстанне гістарычных сядзіб і іх адаптацыя да сучасных культурных умоў» прадугледжана рэстаўрацыя канцэртнай залы ў Залессі і абсталяванне канферэнц-залы ва Ужутракісе. Чым жа паядналіся беларускае Залессе і літоўскі Ужутракіс, маёнткі Міхала Клеафаса Агінскага і графа Юзафа Тышкевіча?

— У свой час яны, прадстаўнікі вядомых магнацкіх родаў, былі суседзямі, сустракаліся, уплывалі на культурнае жыццё рэгіёна. А сёння дзякуючы сумеснаму праекту ўжо мы, іх нашчадкі, наладжваем сувязі ў галіне культуры, а далей, спадзяёмся, і ў турызме. А дзе турызм — там і эканоміка. Мяркую, што гэта «доўгайграючы» праект з добрымі наступствамі, — лічыць **намеснік старшыні Смаргонскага райвыканкама Генадзь БЫЧКО.**

Нядаўна ў рамках праекта смаргонцы азнаёміліся з вопытам сваіх літоўскіх партнёраў па аднаўленні палаца графа Тышкевіча ва Ужутракісе. **Дырэктар Тракайскага нацыянальнага парку Гінтарас АБАРАВІЧУС** распавёў, што гэтая справа заняла амаль 20 гадоў, былі задзейнічаны сродкі шэрагу праектаў з розных фондаў. Цяпер сядзіба з'яўляецца ўпрыгажэннем нацыянальнага парку, месцам паломніцтва турыстаў, культурных імпрэз.

Менавіта на стварэнне турыстычнага, культурнага цэнтра (што не абмяжоўваецца рэстаўрацыяй канцэртнай залы ў Залессі і пакупкай для яе раяля) найперш і скіраваны гэты праект па гістарычных сядзібах. Такая мэта не выглядае на Смаргоншчыне нейкай навацыяй, а будзе лагічным працягам таго, што робіцца не першы год. Напрыклад, ужо традыцыйным стаў фестываль-кірмаш «Залессе запрашае сяброў», які прыцягвае многіх выхадцаў з гэтых мясцін і турыстаў. Акрамя таго, нядаўна ў Смаргоні адбыўся ўжо X міжнародны фестываль камерных ансамбляў імя М.К. Агінскага, у якім удзельнічалі 11 калектываў з Беларусі, Казахстана, Польшчы, Расіі і Украіны. А наступны конкурс — у 2015-м, у гонар 250-годдзя з дня нараджэння Міхала Клеафаса — верагодна, адбудзецца ўжо ў Залессі, у адноўленай канцэртнай зале. Ёсць і іншыя цікавыя задумы.

Дарэчы, зала, дзе цяпер працуюць рэстаўратары, будзе прыстасавана не толькі для музычных імпрэз, але і для тэатральных. Ужо ёсць зацікаўленасць з боку Мінскага абласнога драматычнага тэатра прыехаць са спектаклем «Паланэз на развітанне» — туды, дзе ў канцы 1822 года Міхал Агінскі ў апошні раз абышоў парк, пастаяў каля памятнага каменя ў гонар Касцюшкі і сеў у карэту, якая рушыла праз ліпавую алею... Каб больш ніколі не вярнуцца. Але назаўжды застацца ў Залессі!

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

Аднаўленне палаца.








Ліпавая алея, па якой конныя экіпажы прыязджалі ў маёнтак Агінскіх

■ Zамор'е

## ТРУСЫ ПРАЕЛІ... ВОСТРАЎ



Пражэрлівыя трусы праелі шатландскі востраў Кана. Жывёлы бесперашкодна перамяшчаюцца па востраве, з'ядаюць усю расліннасць, капаюць норы і нават выкопваюць косткі з магіл. Жыхары шатландскага вострава абвясцілі вайну трусам. Апошняй кропляй для іх стала тое, што незлічоныя норы жывёл выклікалі на востраве апоўзні. З-за гэтага закрыта адзіная мясцовая дарога.

На востраве Кана ў Шатландыі пражываюць усяго 12 чалавек і амаль 16 тысяч трусоў. «Трусы — гэта горшае, з чым мне давялося сутыкнуцца за 51 год, пражыты тут, — распавёў мясцовы жыхар Віні МакКінан. — Яны паўсюль. З-за іх рушацца каменныя сцены... Неабходна нешта рабіць. Яны літаральна з'ядаюць востраў». У Нацыянальным фондзе Шатландыі, якому належыць востраў, вырашылі прыняць меры, каб знізіць папуляцыю жывёл. Улады думаюць, які спосаб знішчэння трусоў будзе найбольш гуманным.

«Трусіная праблема» паўстала на востраве практычна адразу ж пасля таго, як мясцовыя жыхары змаглі пазбавіцца ад пацукоў. Вайна супраць гэтых грызуноў пачалася ў 2005 годзе. Тады група экспертаў з Новай Зеландыі выкарыстала смяротную прынаду. Аперацыя прайшла цалкам паспяхова: у лютым 2006 года была знойдзена і ўтылізавана апошняя тушка грызуна. Аднак прыроду перамагчы немагчыма, асабліва калі чалавек не можа прадбачыць наступстваў свайго ўмяшання ў яе справы. Знікненне адной бяды прывяло да другой: замест адных прыйшлі іншыя грызуны-разбуральнікі.

## ЧЫТАЙЦЕ ЦІКАВА І ХУТКА

Арыгінальны спосаб прывучыць людзей чытаць знайшлі ў Аргенціне. Там пачалі тыражаваць кнігі, якія пачынаюць хутка псавацца пасля таго, як іх вызваляць ад упакоўкі.



Тэкст надрукаваны спецыяльнай фарбай. Калі кнігу распакоўваюць і на паперу пачынае трапляць паветра і святло, літары проста знікаюць і застаюцца толькі белыя лісты. Дэвіз выдаўцоў — «Кніга не можа чакаць». У лінейцы выпускаюць анталогію твораў маладых лацінаамерыканскіх аўтараў. І што характэрна, кнігі карыстаюцца папулярнасцю: прэм'ерны наклад быў распрададзены ўжо ў першы дзень выпуску. У наступным годзе выдавецтва абяцае выпусціць кнігу для тых, хто любіць чытаць у басейне і ў ваннай. Гэта будуць выданні, якія не баяцца вады.

## ПАРКУЙЦЕСЯ І ЦАЛУЙЦЕСЯ




На поўначы Італіі ў горадзе Падуя з'явілася незвычайная паркоўка. Каля чыгуначнага вакзала мясцовыя ўлады абсталявалі адмысловае месца для пацалункаў. На пад'ездзе да вакзала з'явілася спецыяльная паласа з надпісам «Паркоўка+пацалунак». Яна прызначана для таго, каб пары, развітваючыся, маглі цалавацца і не перашкаджаць мінакам. Аднак і там таксама нельга затрымлівацца доўга: тых, хто хоча правесці апошнія хвіліны ў цёплых абдымках адно аднаго, нямала. Ідэя была прынята пасля таго, як даследаванні паказалі, што італьянскія парачкі стваралі заторы. Гарачае развітанне доўжылася «бясконца», незалежна ад чаргі, якая стваралася ззаду. Пры гэтым італьянцы рэдка рабілі закаханым заўвагі.

Зараз «Паркоўка + пацалунак» дазваляе тым, хто ад'язджае і праводзіць іншых, стаяць на гэтай паласе да 15 хвілін, каб сказаць каханым на развітанне галоўныя словы. Мэр Падуі Іва Росі адзначыў: «Страснасць — гэта частка італьянскага характару. Зразумела, што людзі хочуць праявіць свае пачуцці з дапамогай пацалунка, калі развітваюцца на нейкі час». Ён адзначыў, што новы праект меў ашаламляльны поспех і многія людзі карыстаюцца новаўвядзеннем. Як следства, працяглыя затрымкі на вакзале цяпер адышлі ў мінулае.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС**

■ Факт

## Падручнік... у смартфоне

**Рэзідэнт Парка высокіх тэхналогій кампанія «Сакрамэнт IT» распрацавала і размясціла ў свабодным доступе эксперыментальны ўзор праграмнага комплексу «Мультымедыйная бібліятэка школьніка».**

Як паведамляе прэс-служба Парка высокіх тэхналогій, праграмнае рашэнне дазваляе стварыць для сучасных дзяцей камфортныя ўмовы навучання. Яно будзе ўключаць у сябе ўсе падручнікі, вучэбныя дапаможнікі і факультатыўныя матэрыялы па школьнай праграме з 5-га па 11-ты класы. Праект «Мультымедыйная бібліятэка школьніка» быў распрацаваны па заказе Міністэрства адукацыі і ўключае толькі зацверджаныя вучэбныя дапаможнікі. Плануецца, што ў праграме з'явіцца магчымасць дадаваць і рэдактаваць заметкі і закладкі, будзе наладжана сістэма пошуку па ключавых словах, а таксама даступнай стане функцыя сінтэзу маўлення. Дадатак даступны для Windows і Android. Гэта значыць, што карыстацца мультымедыйнай бібліятэкай можна будзе і з планшэтаў, і са смартфонаў.

Зараз у свабодным доступе знаходзіцца эксперыментальны ўзор комплексу, які ўключае ў сябе матэрыялы па прадмеце «Біялогія» для 6—11-х класаў. Праграма дазваляе прагледжваць электронную версію падручніка, актывізаваць доступ да гласарыя са спецыяльнымі тэрмінамі і афармляць падпіску на атрыманне больш глыбокіх і пашыраных ведаў са спецыялізаваных крыніц. Дадатак дазволіць школьнікам атрымліваць абнаўленні і мець доступ да дадатковых матэрыялаў па ўсіх школьных прадметах у выглядзе відэаматэрыялаў, малюнкаў і схем, а таксама 3D-мадэляў з магчымасцю іх трансфармацыі. Таксама з дапамогай праграмы можна будзе скарыстацца даведнікам у выглядзе гласарыя.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

Даты | Падзеі | Людзі

**1797** год — нарадзіўся Генрых Гейне, нямецкі паэт. Свайму паэтычнаму поспеху Генрых Гейне абавязаны маці і дзядзьку — бібліяману, які аддаў у распараджэнне пляменніка бібліятэку. Дзякуючы сваім вершам Гейне стаў адным з самых славутых лірыкаў усіх часоў. «Падарожжа па Гарцу», «Паўночнае мора» — гэтыя творы таленавіта выяўляюць народныя матывы і музыку прыроды. У той жа час вершы нямецкага паэта напоўнены іранічным смехам і сатырай, на якія Гейне глядзеў як на караючую сілу паэзіі ў барацьбе з несправядлівасцю. На думку Генрыха Гейнэ, галоўнае ў творчасці любога паэта — чалавечнасць у самым шырокім значэнні гэтага слова.



**1920** год — на 2-м Усебеларускім з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў прынятыя дапаўненні да Канстытуцыі БССР 1919 года і ратыфікаваны прэлімінарны дагавор паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. З'езд выказаўся за пераклад усіх дзяржаўных устаноў на беларускую мову. Пачатак беларусізацыі.

**1936** год — нарадзіўся Аляксандр Васільевіч Зубаў, беларускі мовазнавец. Акадэмік Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі (1996), доктар філалагічных навук, прафесар (1986). З 1965 года — у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце (з 1995-га — прарэктар). Аўтар прац па праблемах лінгвістыкі тэксту, камп'ютарнай лінгвістыкі, штучнага інтэлекту.

Было сказана

**Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, класік беларускай літаратуры і драматургіі:**

*«Што зрабіў дабро, душа мая рада».*

■ Крымінал

## Дырэктар краў... рондалі

**Суд Браслаўскага раёна за крадзеж шляхам злоўжывання службовым становішчам у буйным памеры прыгаварыў да пазбаўлення волі на тры гады цяпер ужо былога дырэктара турыстычна-аздараўленчага прадпрыемства «Браслаўскія азёры».**

Асуджаны адпрацаваў на адказнай пасадзе нядоўга — з чэрвеня 2010 года па красавік мінулага. У сувязі з тым, што турбаза не мела асабліва каштоўнай маёмасці, дырэктар вырашыў задаволіцца тым, што трапляла на вочы. І схему крадзяжу выбраў, можна сказаць, простую. Ён даў сваім падначаленым пералік маёмасці і распарадзіўся ацаніць яе па прымальным кошце, а потым спісаць як нягодную. Рондалі эмаліраваныя, іншыя кухонныя, а таксама пасцельныя рэчы; крэслы, дываны і дывановыя дарожкі, два тэлевізары, вуглавая канапа... Агульны кошт украдзенага — больш як 8,7 мільёна рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 9.20 | 16.47 | 7.27 |
| Віцебск | 9.17 | 16.29 | 7.12 |
| Магілёў | 9.10 | 16.37 | 7.27 |
| Гомель | 8.58 | 16.42 | 7.44 |
| Гродна | 9.34 | 17.04 | 7.30 |
| Брэст | 9.26 | 17.13 | 7.47 |

### Месяц

*Першая квадра 9 снежня. Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

***Пр.** Андрэя Першазванага.*
***К.** Люцыі, Юліі, Пятра, Уладзіміра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Жонка пакрыўдзілася і не размаўляе са мной ужо два дні. Цішыня і спакой, я шчаслівы. Толькі б не даравала.

**Два прыяцелі.**
**— Уяўляеш! Учора ўбачыў сваю жонку пад руку з нейкім мужыком!**
**— Так, і чаму ж ты да іх не падышоў?**
**— Ну як я падыду? Я ж у камандзіроўцы!**

Учыніўшы выбух, крутыя хлопцы ў кіно спакойна ідуць прэч, не паварочваючыся. Я тое ж самае раблю, калі выпадкова нешта зламлю або павалю ў краме.




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.758. Індэкс 63850. Зак. № 5380.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 снежня 2013 года.